№ 26 (384) 16 ліпеня 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Падарункі да 10-годзьдзя
Масква дала болей, чым Цапф.
старонка 2

Пад аранжавымі сьцягамі
Украіна: прэзыдэнцкая кампанія Юшчанкі.
старонка 6

Мілыя падрабязнасьці
Зь непублічнага жыцьця беларускага войска.
старонка 9

Грошы бягуць у сталіцу
Агляд рынку нерухомасьці.
старонка 8

Дзесяць год тэатру

Дзесяць гадоў таму, 20 ліпеня 1994 году, Аляксандар Лукашэнка прынёс прысягу ў якасьці прэзыдэнта. Тэма нумару — старонкі 3—5.

Бацька палавіны нацыі

«Пару гадоў да ўвацарэньня Лукашэнкі існавала маса палітычных інтарэсаў, скіраваных на рэстаўрацыю савецкае спадчыны, якія не былі належным чынам прадстаўленыя на палітычным полі. Нездарма Сакрат Яновіч успрымаў Менск пад бел-чырвона-белымі сьцягамі як горад пад беларускай акупацыяй. Лукашэнка выкарыстаў гэта для ўласных палітычных мэтаў». Гутарка з Валерам Булгакавым. **Старонка 3.**

Маўчаньне травы

Дзесяцігодзьдзе — яшчэ больш умоўны адрэзак гісторыі, чымся, напрыклад, стагодзьдзе. Тым ня менш, здараюцца супадзеньні ў часе, якія нібы самі па сабе вымушаюць праводзіць нейкія паралелі. Дзесяць гадоў таму памёр вялікі правадыр карэйскага народу, горача любімы кіраўнік КНДР… Эсэ Віталя Тараса. **Старонка 5.**

Арыфмэтыка дыктатуры

1994—2004: 4800 затрыманых, 55 палітычных крымінальнікаў. «НН» падлічвае. **Старонка 3.**



Басовішча

23—24 ліпеня ў Гарадку пад Беластокам — юбілейны фэст беларускага року.

Арганізоўваецца паездка: тэл. 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74.

Дык падпісвайся!

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць па пошце, а ў Менску — і на шапікі "Белсаюздруку". Цана на месяц — 2700 рублёў на поштах або 2500 рублёў на шапікі "Белсаюздруку". Гэта абыдзецца нашмат таньней, чым купляць ураздроб.

10 гадоў пасьля інфаркту

Наіўна думаць, што эканоміка Беларусі апошнія 10 гадоў разьвіваецца дзякуючы Лукашэнку і што дзякуючы яму ж у краіне пануе мір. Ёсьць аб'ектыўныя працэсы разьвіцьця, ёсьць беларускі народ, якому не ў галаве ваяваць з кім-небудзь ці з самім сабой, ёсьць тысячы разумных, гаспадарлівых і самастойных людзей, якія трымаюць краіну «на плаву» насуперак высокім дырэктывам, а ня дзякуючы ім.

Наіўна думаць, што без Лукашэнкі ў нас не будаваліся б кальцавыя дарогі, бібліятэкі і лядовыя палацы. Толькі ва ўсім гэтым болей было б мэтазгоднасьці. Кальцавая ня йшла б па касьцях ахвяраў камунізму, палацы не ператвараліся б урэшце ў барахолкі, а бібліятэка не выглядала б на апошні прыстанак «беларускага Рэйгана».

Наіўна думаць, што сякі-такі парадак у краіне забясьпечваецца на сэлектарных нарадах. Калі прыдарожны падлесак высякаецца, а бардзюры белеюць толькі таму, што так загадаў Лукашэнка, тады краіна пачынае нагадваць ня мілую сэрцу Бацькаўшчыну, а вайсковы гарадок, у якім заўтра пачнуць фарбаваць пажаўцелае лісьце на дрэвах.

Наіўна меркаваць, што пэнсіі ў нас выплачваюцца рэгулярна, што працоўныя калектывы захоўваюцца, а цэны ў крамах і ЖЭСах стрымліваюцца — дзеля клопату пра пэнсіянэра, рабочага ці кватэранаймальніка, а не таму, што гэта — усяго толькі дробныя падачкі ўлады, якая такім чынам стрымлівае народ ад абурэньня.

10 гадоў Беларусі было больш чым дастаткова, каб пераканацца, што ёй не патрэбны такі прэзыдэнт. Як курам не патрэбны камандзір над нясеньнем яек, як хмарам у небе не патрэбны рэгуліроўшчык, як паэтам не патрэбны суфлёр. Замест збалянсаванага грамадзтва мы атрымалі адзінаўладнага правіцеля і глыбокі тромб у самым сэрцы народу. Лукашэнка — гэта інфаркт. І народ галасуе за яго, як інфарктнік, зь якім гэтая бяда ўжо здарылася. Маўляў, навошта падманваць сябе самога і выбіраць нейкае іншае, здаровае жыцьцё, калі ты ведаеш, што ў тваім сэрцы — закупорка?

Мы сапраўды хацелі б жыць «як у Эўропе», але не былі да гэтага гатовыя, баяліся сурочыць, ня мелі дастаткова нацыянальнай годнасьці і самапавагі, каб перамагчы гэтую боязь — уявіць сябе паўнавартаснымі эўрапейцамі.

За мінулыя 10 гадоў Лукашэнка мноства разоў парушыў Канстытуцыю і прэзыдэнцкую прысягу, гэта значыць, паставіў сябе па-над законам. І людзі сапраўды ня бачаць яму альтэрнатывы, бо альтэрнатывай Лукашэнку можа быць толькі другі Лукашэнка, другі ўзурпатар улады і парушальнік Канстытуцыі і прысягі. Другі дыктатар. «А хто, калі ня ён?» — пытаюцца людзі, бо адначасова і разумеюць і баяцца пэрспэктывы другога інфаркту. Лепей ужо жыць зь першым, але з адным.

Уся праблема — у нашай самапавазе. Лукашэнка як можа топча гэтае пачуцьце — прыніжае паважаных у народзе людзей, ганьбіць беларускую мову, перакручвае ды ўразае нашу старажытную гісторыю. Інфаркт робіць сваю справу. Мы пачуваемся бязвольнымі самі зьмяніць свой лёс. Можа быць, мы ўжо і дасьпелі да таго, каб адчуць сябе роўнымі зь іншымі эўрапейцамі, але адна фармальная прыкмета адрозьнівае нас ад іншых народаў, нашых суседзяў — мы не гаворым па-свойму. Інфаркт разумее гэта і працягвае зьнішчаць нашую годнасьць: зачыняе беларускія школы, выганяе мову са сродкаў масавай інфармацыі, робіць самое гучаньне беларускага слова прыкметаю апазыцыі.

Наіўна думаць, што наступствы нашага інфаркту пераадолее нехта звонку. Натуральна, над нашым распластаным целам схіліліся «дактары» і з Брусэлю, і з Масквы. Але ўсё адно ўсё залежыць ад нас. Ад таго, як нашае пачуцьце самапавагі здолее вярнуць краіну ў законны стан, туды, дзе ўсе роўныя перад законам і дзе закон — па-над усім. Паводле Канстытуцыі гэта павінны зрабіць парлямэнт і канстытуцыйны суд. У 1996 годзе ім не дала гэта зрабіць Масква, груба ўмяшаўшыся ва ўнутраныя справы Беларусі і захаваўшы Лукашэнку, які на той момант 17 разоў парушыў Канстытуцыю, ад імпічмэнту. Адчуўшы сябе пераможцам, Лукашэнка адабраў у парлямэнту і суду апошнія іхныя паўнамоцтвы, а сябе ўзнагародзіў за перамогу двума дадатковымі гадамі.

І тым ня менш, толькі парлямэнт і канстытуцыйны суд — гэтае слабое, амаль што мёртвае сэрца ў арганізьме дзяржавы — могуць вярнуць Беларусь да закону і парадку. Зробяць яны гэта самі ці пад націскам апазыцыі — неістотна. Галоўнае — каб выздаравець, краіна павінна вырашыць сваю праблему сама.

Што будзе, калі Лукашэнкі ня будзе?

Будзе моцны парлямэнт. Як гэта было спрадвеку. Беларусь за ўсю сваю 1000-гадовую гісторыю ні разу ня ведала свайго ўласнага аўтарытарнага кіраўніка — толькі веча, толькі сойм, толькі партыі — прадстаўнікі інтарэсаў розных групаў насельніцтва. Цяпер у нас ёсьць і вопыт уласнага дыктатара.

На экранах шасьці-сямі незалежных тэлеканалаў мы будзем сачыць за думкай соцень публічных асобаў Беларусі, а не адной. З дынамікаў радыё перастануць гучаць сіпатыя «наганяі».

Скончыцца застой у нацыянальным разьвіцьці — тысячы людзей зоймуцца творчай беларускай працай. Бо пачуцьце самапавагі народу патрабуе пастаянных высілкаў вялікае колькасьці народу. І гэта сьветлая, творчая праца.

Дырэктары заводаў будуць самі разьвіваць вытворчасьць, а не для Лукашэнкі ці каб пазьбегнуць турмы...

Самае галоўнае — краіна вернецца да стану збалянсаваных інтарэсаў усіх сваіх жыхароў. А прадстаўнікі народу будуць пачувацца ягонымі слугамі, а не гаспадарамі. І будуць любіць сваю краіну, яе людзей і яе даўнія традыцыі, а ня кідацца абсурднымі фразамі, якімі ўвайшло ў гісторыю гэтае дзесяцігодзьдзе Лукашэнкі, за што нам яшчэ доўга будзе соромна перад сабою і ўсім сьветам: «Я сваю дзяржаву за цывілізаваным сьветам не павяду»; «Нічога талковага па-беларуску выказаць немагчыма»; «Гітлераўская Германія адпавядае нашым уяўленьням пра прэзыдэнцкую рэспубліку».

Сяргей Паўлоўскі

Масква зноў дала больш, чым Ута Цапф

Крэмль падтрымаў квітнеючую беларускую эканоміку матэрыяльна. Кіраўніца ж рабочай групы парлямэнцкай асамблеі АБСЭ абмежавалася вітаньнем палаце прадстаўнікоў, што гэтак адважна змагаецца за пашырэньне функцый заканадаўчай улады. Усе гэтыя падарункі былі прэзэнтаваны перад 21 ліпеня, калі апазыцыя мае заклікаць А.Лукашэнку да адказнасьці за 10 гадоў кіраўніцтва.

Расея й Беларусь узгаднілі ўмовы выдачы Менску крэдыту на $175 млн. Гэтыя шчодрыя, МВФаўскага размаху грошы патрэбныя Менску, каб расплаціцца з «Газпромом» за пастаўкі газу па павышанай цане. Пры гэтым умовы крэдыту расейская «Независимая газета» называе падарункам Лукашэнку. Крэдыт выдаецца па стаўцы Libor +0,8% гадавых на 6 гадоў (аддаваць прыйдзецца ў 2010 г., перад прэзыдэнцкімі выбарамі 2011-га) з адтэрміноўкай платы ў рахунак пагашэньня асноўнае запазычанасьці на 1,5 году. Умовы крэдытаваньня настолькі льготныя, што само сабою напрошваецца меркаваньне пра палітычную падаплёку рашэньня. І што самае галоўнае, у Крамлі, у адрозьненьне ад Эдынбургу, ніхто не зудзіць, што Яўген Новікаў павінен даць слова нейкай там Зінаідзе Бандарэнцы.

Барыс Тумар

Апошні пралетар

Усевалад Гарачка. Пралетарскія песні: Вершы. — Менск: Логвінаў, 2004. 400 ас.

Невялічкі кідка афармлены зборнік можна прачытаць хвілінаў за пятнаццаць. Але рабіць так ня варта: не зачэпіць. Патрэбен нейкі час на адаптацыю да Гарачкавага сьвету, поўнага ўжо нерэальных савецкіх фантомаў і трапна падгледжаных постсавецкіх рэаліяў.

Аўтар працуе на мяжы кічу, дасьледуючы блытаны і часта абсурдысцкі ўнутраны сьвет генэрацыі, якая развал СССР сустрэла ўжо ў досыць сьвядомым веку. Заглыбляючыся, ён ахвяруе формай. Адсюль схематычнасьць і знарочыстая лексычная беднасьць вершаў. Вобразнасьць, як дробнабуржуазны элемэнт, у пралетарскіх песьнях сустракаецца толькі месцамі. Але колькасьць кампэнсуецца якасьцю — чаго вартыя адны «сьвінцовыя крылы каханьня».

ЯК

«Фінскі парлямэнт вітаў Быкава стоячы»

Віцэ-прэзыдэнт Фінскага ПЭН-Цэнтру Юка Малінэн згадвае хельсынскі пэрыяд Васіля Быкава

Юка Малінэн — мілы фін з клясычным балтыйскім акцэнтам. Будучы віцэ-прэзыдэнтам ПЭН-Цэнтру Фінляндыі, ён памагаў Быкаву ўладкавацца ў сваёй паўночнай краіне, наладзіць побыт. Сп.Малінэн ахвотна згадвае падрабязнасьці гэных двух гадоў. Ён быў адным зь нямногіх, з кім Васіль Быкаў кантактаваў у Хельсынкі. Юка прывёз нам валун Быкава — камень на магілу — і ўспамін пра вялікага пісьменьніка…

Працяг на старонцы 15.

21 ліпеня — буйная акцыя апазыцыі

21 ліпеня дэпутаты з групы «Рэспубліка» запрашаюць выбарцаў на ўсенародны сход. Мэта — ацаніць 10 год прэзыдэнцтва А.Лукашэнкі і выказаць меркаваньне, ці варта яму падаўжаць свае паўнамоцтвы. Арганізатары папрасілі гарвыканкам дазволіць збор удзельнікаў а 18-й на плошчы Якуба Коласа. Сярод падаўцаў заяўкі — Уладзімер Колас і Ірына Красоўская.

У ПАВЕТРЫ

Як ніколі позна зацьвілі сёлета ліпа й чабор. Ліпавы цьвет сушаць у сухім цёмным месцы бязь лішніх пахаў, тады зь яго будзе духмяны чай на ўсю зіму.

НАВІНЫ

Зацьверджана дата выбараў

Выбары ў палату прадстаўнікоў прызначаныя на 17 кастрычніка.

Манаполія на аўтастрахаваньне

Ад 1 жніўня будуць дзейнічаць новыя правілы страхаваньня аўтамабіляў. Страхаваць аўтамабілі зараз будуць толькі арганізацыі, якія належаць дзяржаве болей чым на 50%. Недзяржаўным кампаніям давядзецца істотна звузіць сваю дзейнасьць. На думку незалежных экспэртаў, манаполія можа дрэнна адбіцца на якасьці паслуг.

З новых нормаў: шкоду пацярпеламу будуць кампэнсаваць незалежна ад таго, ці была грубая неасьцярожнасьць у ягоных дзеяньнях і ці вінаватая асоба, якая зрабіла шкоду.

Падпольная газэта

Яшчэ адна падпольная газэта ўзьнікла ў Беларусі. Называецца яна «Тут і цяпер». Выходзіць яна па-беларуску ды па-расейску і не зьбіраецца рэгістравацца. Разьлічана яна найперш на беларускую правінцыю і аглядае асноўныя навіны мінулага тыдня.

Пілігрымка рабінаў у Радунь

150 рабінаў з ЗША прыбудуць у Беларусь 8 жніўня, каб наведаць юдэйскія сьвятыні. Пра гэта паведамляе «Інтэрфакс». Яны пабудуць на магіле шанаванага рабіна Хофец Хаіма ў Радуні, а таксама ў Міры й Валожыне.

Трыюмф расейскіх вампіраў

Фільм «Начны дазор» абяцае стаць самым касавым у Расеі за апошняе дзесяцігодзьдзе. На зьмену ваенным істэрнам і адметнасьцям нацыянальнае гарэлкі прыйшлі вампіры й ваўкадавы. Паводле першых ацэнак, за тыдзень паказу карціну ўбачаць больш за мільён гледачоў, а зборы перавысяць 3,5 млн даляраў. Упершыню расейская карціна зьбірае больш гледачоў, чым апошнія галівудзкія прэм'еры.

Клімук станцуе ў Елізар'ева

У аўторак Беларускі балет выправіўся на Кіпр на курортны фэстываль «Найвялікшыя балеты сьвету». Беларусы павезьлі туды новую рэдакцыю знакамітага елізар'еўскага «Тыля Ўленшпігеля» з маладым Тылем — Дзянісам Клімуком.

Асуджаны супэркардэр

У мінулую пятніцу суд Менску пакінуў у сіле прысуд чалавеку, якога лічылі самым пасьпяховым кардэрам Беларусі. Легендарная асоба сярод кампутарных махляроў, праграміст Міхал Макееў асуджаны на пяць год турмы. Суд палічыў даказаным, што круцель накупляў у інтэрнэт-крамах па чужых картках тавараў на 110 тыс. даляраў.

МБ; радыё «Свабода», БелаПАН

Дзесяць дасягненьняў Аляксандра Лукашэнкі

Эканамічны рост
Крытыкі: «Вынік спрыяльнай каньюнктуры, рост адбываецца ва ўсіх краінах СНД, незалежна ад таленту іхных кіраўнікоў. У Беларусі затое не праведзена мадэрнізацыя эканомікі, не рэфармаваны адносіны ўласнасьці».

Стабільнасьць
Крытыкі: «Гэта слова, якое нічога ня значыць. Што, у Літве ці Фінляндыі нестабільнасьць? Гэта фасад, за якім масава парушаюцца правы чалавека, калі асоба бяспраўная перад сыстэмай, а сама сыстэма ў доўгатэрміновым пляне няўстойлівая, бо не грунтуецца на праве і прыватнай уласнасьці».

Добраўпарадкаваньне і чысьціня
Крытыкі: «Паказуха і безгустоўнасьць».

Захаваньне незалежнасьці
Крытыкі: «Насуперак ягонай волі. Міжнародная ізаляцыя і адсутнасьць шанцаў на ўваходжаньне ў Эўразьвяз, без чаго краіна застаецца на задворках».

Нізкая карупцыя
Крытыкі: «Гэта не заслуга Лукашэнкі, а нацыянальная асаблівасьць».

Сацыяльная абароненасьць
Крытыкі: «Дэградацыя і сьпіваньне, асабліва вясковага насельніцтва, набылі нечуваныя памеры. Упершыню ў Беларусі сталі піць больш, чым у Расеі».

Фармаваньне ўласнае палітычнае эліты
Крытыкі: «Лукашэнка раскалоў грамадзтва, дзеліць людзей на сваіх і чужых, пашырае хамства і нецярпімасьць».

Посьпехі ў спорце
Крытыкі: «Наадварот, спорт не атрымаў саліднай базы і спонсараў. А якое Лукашэнка мае дачыненьне да генэтычнага патэнцыялу волатаў-беларусаў?»

Міжнацыянальны мір
Крытыкі: «А ў Беларусі і так ніколі не было міжнацыянальных канфліктаў. Затое ніколі раней не шальмаваліся нацыянальная мова і культура».

Захаваньне ўсеагульнай адукацыі
Крытыкі: «Павелічэньне адрыву ад перадавых краін, зьніжэньне прэстыжу адукацыі, заняпад сярэдняй школы».

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Бацька палавіны нацыі

Хто такі гэты Лукашэнка, які пратрымаўся наверсе 10 гадоў?
З аднаго боку, у яго ёсьць эўрапейскія прававыя інстынкты, якія дазваляюць Беларусі мець узровень карупцыі, роўны славенскаму. З другога боку, ён жыве паводле ўласных маральных нормаў, як такі сучасны Радзівон Раскольнікаў. У эканоміцы ён давёў сваю адносную эфэктыўнасьць, а ў культуры й палітыцы ён эгацэнтрычны фанатык улады, які бязьлітасна зьнішчае любую альтэрнатыву, — гаворыць Валер Булгакаў, рэдактар часопісу "ARCHE".

«НН»: Ці можам сказаць, што Лукашэнка — вялікі няўдачнік, які ня змог рэалізаваць тое, што хацеў, — аднаўленьне СССР — і змушаны быў саступіць людзям, якія гэтага не хацелі?

Валер Булгакаў: Лукашэнка — рэалізатар пэўных раней не асэнсаваных памкненьняў грамадзтва. Калі браць этыкеткі, якія яму прыклейваліся на розных этапах ягонага палітычнага шляху, ён не нацыянальны здраднік ці агент ФСБ, як думае Зянон Пазьняк, а хутчэй агульнанацыянальны правакатар, які справакаваў глябальны выбух дэструктыўнага патэнцыялу масавай сьвядомасьці, які да таго часу загамоўваўся дзякуючы розным палітычным і інфармацыйным мэханізмам. Пару гадоў да ўвацарэньня Лукашэнкі існавала маса палітычных інтарэсаў, скіраваных на рэстаўрацыю савецкае спадчыны, якія не былі належным чынам прадстаўленыя на палітычным полі. Нездарма Сакрат Яновіч успрымаў Менск пад бел-чырвона-белымі сьцягамі як горад пад беларускай акупацыяй. Лукашэнка як палітык, што ўжываў якасна новую рыторыку і прапаноўваў якасна новую канцэпцыю ўзаемадзеяньня з публікай, выкарыстаў гэта для ўласных палітычных мэтаў, паспрабаваў увасобіць гэтыя палітычныя інтарэсы. А кожны лёзунг ці тавар, попыт на які быў заўважаны і задаволены, траціць у сваёй рынкавай вартасьці.

Акрэсьленай жа праграмы палітычнага будаўніцтва ў Лукашэнкі ніколі не было. Найбольш ясную праграму ён меў у эканамічнай сфэры. І ў ёй дасягнуў найбольшых посьпехаў. Ён даказаў, што нават пры аўтарытарызьме можна дасягнуць эфэктыўнага эканамічнага разьвіцьця, калі пазьбегнуць такіх нэгатыўных зьяваў, як карупцыя, алігархія і сацыяльнае расслаеньне.

Працяг на старонцы 4.

Яўген Афнагель: «Ён увасабляе абсалютнае зло»

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Самым зацятым праціўнікам Лукашэнкі і лукашызму зьяўляецца моладзевы рух «Зубр». Каардынатар «Зубра» Яўген Афнагель — жывая легенда арганізацыі. Яго затрымлівалі 25 разоў, садзілі, зьбівалі. Ён працягвае змагацца, калі іншым здаецца, што гэты камень нішто не зварухне.

«НН»: Чаму «Зубр» у такой радыкальнай апазыцыі Лукашэнку? Што для Вас абсалютна непрымальна ў ім?

ЯА: Тое, што ён імкнецца да аднаўленьня таталітарнай савецкай сыстэмы, што ён не праводзіць эканамічных рэформаў, што вырывае нашу краіну з Эўропы і арыентуе толькі на ўсход, што парушаюцца правы чалавека, што няма падзелу ўлады, што адсутнічаюць пэрспэктывы для моладзі, што ў загоне нацыянальная мова і культура, а нацыянальная сымболіка забаронена. З Лукашэнкам у краіны няма будучыні. Бо лёс краіны ня можа залежаць ад аднаго чалавека. Моладзь зьяжджае за мяжу, і віна за гэта ляжыць на ўладзе.

«НН»: Многія зьміріліся з тым, што Лукашэнка — гэта надоўга. Апазыцыя стомленая. «Зубр» — не?

ЯА: Мы верым, што сытуацыя можа быць зьменена. Гэта адбудзецца тады, калі большасьць людзей паверыць, што яе можна зьмяніць. Нашы дзеяньні накіраваныя на тое, каб абудзіць веру ў грамадзтве, зламаць страх, зьнішчыць бязьвер'е, калі большасьць людзей не прымае дыктатуры, але лічыць, што яе немагчыма зьмяніць.

«НН»: Колькі людзей у «Зубры», якіх затрымлівалі больш за 10 разоў?

ЯА: Больш за шэсьцьдзесят.

«НН»: Не баіцеся, што ўсё намарна?

ЯА: Лукашэнка ўвасабляе абсалютнае зло для нашай краіны. А з абсалютным злом нельга прымірацца.

«НН»: Гэтыя 10 гадоў былі для гісторыі…

ЯА: …10 гадамі, калі паўстаў моладзевы супраціў, калі тысячы маладых людзей зразумелі сваю адказнасьць за лёс краіны і далучыліся да змаганьня з сыстэмай.

«НН»: Колькі яшчэ А.Лукашэнка будзе прэзыдэнтам, Ваш прагноз?

ЯА: Калі апазыцыя аб'яднаецца, максымум, які ён пратрымаецца, — два гады.

Гутарыў МБ



Арыфмэтыка дыктатуры

1994—2004: 4800 затрыманых, 55 палітычных крымінальнікаў

Штогод у Беларусі адбываецца каля 60 тыс. грамадзянскіх працэсаў, каля 50 тыс. крымінальных. Колькасьць адміністрацыйных правапарушэньняў, паводле статыстыкі Міністэрства ўнутраных спраў, сягае 5 млн штогод. Да судоў даходзіць каля 300 тыс. выпадкаў, бо іх разглядам займаюцца яшчэ й адміністрацыйныя камісіі, а то і проста міліцыянты. Колькі з гэтых працэсаў маюць палітычную матывацыю?

Поўнай статыстыкі палітычных працэсаў не вядзе ніхто. Паводле ацэнак Беларускага Хельсынскага камітэту, у 2003 г. на палітычна матываваных адміністрацыйных працэсах (пасьля затрыманьня на мітынгах, пікетах і пры раздачы ўлётак ды газэт) былі асуджаныя каля 110 чалавек. Прысуды — штрафы, арышты, судовыя папярэджаньні. Агульная ж колькасьць затрыманых у 2003 г., паводле падлікаў «НН», складае 600 чалавек. Большасьць адпускалі без пратаколаў.

Леташні год быў спакойным у палітычным сэнсе. Калі колькасьць пацярпелых паводле палітычных матываў у ім узяць за мінімум, дык атрымаецца, што за 1996—2004 г. маем ня менш за 4800 затрыманых. Калі ж згадаць бурныя 1996-ы (вулічныя веснавыя акцыі), 1999-ы (калі адбываліся паралельныя прэзыдэнцкія выбары), 2001-ы (яшчэ адны выбары), то колькасьць пацярпелых можа быць і большай.

Працяг на старонцы 4.

REUTERS

Бацька палавіны нацыі

Працяг са старонкі 3.

«НН»: Цяпер, калі Лукашэнка правёў на сваёй пасадзе 10 гадоў, з боку ягоных былых крытыкаў гучаць выказваньні, што яму выпала стаць не магільшчыкам беларускай дзяржаўнасьці, а — з уласнай волі ці міжволі — бацькам нацыі. На думку Юр'я Дракахруста, гісторыя паставіць яго ў адзін пантэон зь Вітаўтам ці Машэравым — як чалавека, пры якім ствараліся беларускія дзяржаўныя інстытуты.

ВБ: Гэта гледзячы зь якога пункту гледжаньня пазіраць. Разбудове дзяржаўных інстытутаў ён спрыяў. Але разьвіцьцё дэмакратычных інстытутаў і мэханізмаў ён замаруджваў. З пункту гледжаньня багушэвіцкай нацыянальнай традыцыі, ён ішоў насуперак нацыянальным інтарэсам. Зь іншага боку, пры ім нарастала тое мяса, якое непазьбежна мусіць узьнікнуць у кожнай нацыянальнай дзяржаве. Пры Лукашэнку адбывалася навучаньне дзярж-апарату новым прафэсіям і функцыям. Напрыклад, Беларусь сустрэла незалежнасьць без уласнай сыстэмы падрыхтоўкі мытных чыноўнікаў ці вышэйшых афіцэраў. Дарэчы, я цалкам вітаю апошнія рашэньні Лукашэнкі ў адукацыйнай сфэры: заснаваньне ўласнага вайсковага мэдінстытуту, уласнай Акадэміі Генштабу і ператварэньне філіяў у паўнавартасны Баранавіцкі ўнівэрсытэт.

На Ваша пытаньне можна даць такі адказ: Лукашэнка — бацька нацыі, але ня ўсёй нацыі.

«НН»: І помнікі першаму прэзыдэнту будуць стаяць у Беларусі?

ВБ: Франка таксама прыйшоў да ўлады на хвалі хаосу і доўга трымаў уладу, але ў сучаснай Гішпаніі помнікаў Франка няма.

Лукашэнка сьвядома адмаўляецца ад культу сваёй асобы. Ёсьць асобныя плякаты, здымкі, абмежаваная колькасьць выданьняў, да якіх ён напісаў сваю прадмову, у тым ліку ня выдадзеная да канца кніга «Гістарычны выбар Беларусі», але ясна, што пры Лукашэнку самому Лукашэнку помнікаў ставіць ня будуць. Тым больш сумнеўна, што Лукашэнку будуць ставіць помнікі пасьля ягонага сыходу.

«НН»: Але Лукашэнка ўсюды, на першай паласе кожнай газэты. Ці ж гэта не сучасны культ?

ВБ: Яны малююць кіраўніка аўтарытарнай краіны, якая разьвіваецца згодна з указаньнямі правадыра. Такі маем этап разьвіцьця, але да ператварэньня лідэра ў жывое божышча пакуль далёка. Нешта падобнае назіраем цяпер з Пуціным у Расеі.

«НН»: Ці згодны Вы, што ўспрыманьне гістарычнай ролі Лукашэнкі будзе залежаць ня столькі ад таго, што ён зрабіў за першыя 10 год, колькі ад таго, што ён зробіць за астатнія гады свайго кіраваньня?

В.Б.: Нічога новага, думаю, нас не чакае. Асноўны свой наватарскі патэнцыял ён ужо зьдзейсьніў. Пазытыўнае ці нэгатыўнае разьвіцьцё Беларусі будзе залежаць толькі ад таго, як беларуская інтэлігенцыя і беларускі народ асэнсуюць і якія высновы зробяць з часу кіраваньня Лукашэнкі. Рэзкія штуршкі, узьлёты і падзеньні малаімаверныя і магчымыя толькі пад уплывам нейкіх вонкавых фактараў, колькі б гадоў ён ні правёў ва ўладзе — трынаццаць ці дваццаць дзевяць.

«НН»: Калі Лукашэнка затрымаецца на занадта доўгі час, ці не прывядзе гэта да такога застою й закасьцяненьня, што фатальна замарудзіць разьвіцьцё краіны і створыць пагрозу незалежнасьці?

ВБ: Пагрозы для беларускага сувэрэнітэту ў цяперашні момант не існуе, я мяркую. Кіраўнікі цэнтральнаазіяцкіх краінаў падаўжаюць свае паўнамоцтвы, і ні ў каротка-, ні ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве ніякай пагрозы сувэрэнітэту гэта не стварае, бо інэрцыя дзяржаўнай машыны звычай перасільвае тэмпэрамэнт асобна ўзятых палітыкаў, нават калі яны стаяць на вяршыні дзяржаўнай улады. (Праўда, на нядаўнім Сойме КХП-БНФ такую ацэнку асудзілі.)

«НН»: Рост праэўрапейскіх сымпатый і ўмацаваньне нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў — гэта працэсы, што падпісваюць прысуд Лукашэнку, ці ён здолее да іх прыстасавацца?

ВБ: Лукашэнкаў рэжым апартуністычны. Ён часам выкарыстоўвае дыямэтральна супрацьлеглыя лёзунгі. Ён не заўжды адпрэчваў магчымасьць эўраатлянтычнага курсу. Часам ён даваў заходнім назіральнікам пэўныя спадзевы, і гэтая палітыка цяпер працягваецца, хаця рыторыка беларускага МЗС з рыторыкай украінскага МЗС непараўнальная. Я пакуль ня бачу іншых варыянтаў заняпаду гэтага рэжыму, акрамя як праз усеагульны эканамічны крах або фізіялягічныя прычыны, г.зн. хвароба, сьмерць. Рэжым давёў сваю эфэктыўнасьць у кантролі над грамадзтвам. Што да росту нацыянальнай сьвядомасьці, дык гэты фактар становіцца асноўным рэсурсам для выжываньня лукашэнкаўскага рэжыму. Буйныя расейскія аналітыкі не хаваюць, што Крэмль талеруе Лукашэнку толькі таму, што ён спрабуе замарозіць фармаваньне нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў на ўзроўні 78-га году. Гэта стратэгічны момант супадзеньня інтарэсаў Масквы й Менску, які робіць магчымай каапэрацыю нават пры радыкальным разыходжаньні эканамічных інтарэсаў. На Ваша пытаньне можна даць адказ, адказаўшы на яшчэ адно пытаньне: ці можна безь дзяржавы пабудаваць беларускую нацыю, ці можна безь дзяржавы прышчапіць нацыянальную сьвядомасьць усім беларусам? Калі гэта магчыма, тады Лукашэнка падпісаў сабе гістарычны прысуд. Калі гэта немагчыма, то гаварыць нешта пэўнае заўчасна. Тэндэнцыі, пра якія вы гаворыце, яны ж яшчэ суправаджаюцца, асабліва сярод моладзі, адначасовай безыдэйнасьцю, пасіўнасьцю, апатыяй, утрыманскімі вартасьцямі. Сама па сабе праэўрапейская арыентацыя, пакуль яна ня мае палітычнага эфэкту, не ўвасобілася ў буйных палітычных перамогах праэўрапейска настроеных палітыкаў, — гэта пустая абстракцыя.

> Сыстэмы накшталт лукашэнкаўскай маюць элемэнт непрадказальнасьці. Пры ўсёй стабільнасьці яны часам даюць неўяўляльныя ў іншых абставінах збоі. Прычына гэтага — інструмэнтальнае стаўленьне дзеячаў гэтай сыстэмы да права і маралі.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН»: Раней частка грамадзтва яго ненавідзела, другая — абагаўляла. Цяпер эмоцыі згладзіліся. Чаму?

ВБ: 10 год таму Лукашэнка быў свайго роду рэвалюцыянэрам. Ён пачаў прадстаўляць інтарэсы, якія лічыліся вульгарнымі, процістаўленымі нацыянальным адвечным вартасьцям. Ён актыўна ўзбуджаў нацыянальныя пачуцьці. Аднак антанімічнае мысьленьне ў дачыненьні да Лукашэнкі захоўваецца. Маскоўскі аналітык Сяргей Караганаў лічыць яго адным з самых таленавіт-тых палітыкаў СНД, а для Сяргея Навумчыка ён нацыянальны праклён, чалавек, пры якім дэградацыя беларускай дзяржавы дасягнула гістарычнага апагею.

«НН»: Рэжым Лукашэнкі мацнее, слабее?

ВБ: За апошнія гады адбылося нечаканае ўзмацненьне жорсткасьці гэтага рэжыму. Асабліва разбуральная вядзецца культурная палітыка. Тып Лукашэнкі — тып чалавека з культурнага пагранічча. З аднаго боку, у яго ёсьць пэўныя эўрапейскія прававыя інстынкты, якія дазваляюць Беларусі мець узровень карупцыі, роўны славенскаму. З другога боку, ён жыве паводле ўласных маральных і этычных нормаў, уяўляе сабой прыклад сучаснага Радзівона Раскольнікава, які ідзе на разбуральныя палітычныя акцыі дзеля тэндэнцыйна зразуметага «дабра нацыі». У эканамічнай палітыцы ён давёў сваю адносную эфэктыўнасьць, а ў культуры й палітычнай сфэры ён эгацэнтрычны фанатык улады, які бязьлітасна зьнішчае любую палітычную або культурную альтэрнатыву. Беларускамоўных ён успрымае як асобаў проста нейкай іншай культуры. Ён не ўспрымае беларускай гістарычнай традыцыі як сваёй, для яго гэта чужое. Пытаньне, ці стане такая палітыка сапраўдным правакатывам для беларускай інтэлігенцыі. У мінімальна жывым грамадзтве гэта мусіла выклікаць нацыяналістычны адказ. Але старэйшае пакаленьне беларускай інтэлігенцыі, якое ўспрымае дзяржаву як адзіна магчымы матор беларусізацыі, схільнае біць у званы і вапіяць аб роспачы сваёй уласнай. Толькі з гледзішча 50-гадовай пэрспэктывы стане ясна, штуршок у які бок ён даў беларускай культуры. Зрэшты, досыць і таго, што Лукашэнка дазволіў нам зразумець: ня можа быць беларусізацыі зьверху, яна можа ісьці толькі зьнізу. Што ніякія прыгожыя законы не прышчэпяць беларусам нацыянальнай сьвядомасьці і не дапамогуць выдаць тыя кніжкі, якія мы хочам выдаць. Гэта мусіць быць рух зьнізу.

«НН»: Ці не зьяўляецца эканамічны рост апошніх гадоў простым вынікам спрыяльнае сусьветнае каньюнктуры?

ВБ: Беларуская эканоміка — адна з самых эфэктыўных эканамічных мадэляў — але толькі ў рамках СНД. Цяперашні эканамічны курс робіць немагчымым рэфармаваньне, бо эканоміка забюракратызаваная. Посьпехі вытрымліваюць параўнаньне толькі з вынікамі іншых краін СНД. Лукашэнкаўская сыстэма ўцягвае нас, на жаль, у рамкі СНД. Лукашэнка вытрымлівае параўнаньне з Назарбаевым, але не з Адамкусам ці Вікі-Фрайбэрге. Вось прыкры досьвед апошніх часоў. Для мяне гэта адна зь яўных нацыянальных абраз. Ня гэтага мне хацелася.

«НН»: Зьмена Лукашэнку прыйдзе толькі са зьменай пакаленьняў?

ВБ: Сыстэмы накшталт лукашэнкаўскай маюць элемэнт непрадказальнасьці. Пры ўсёй стабільнасьці яны часам даюць неўяўляльныя ў іншых абставінах збоі. Прычына гэтага — інструмэнтальнае стаўленьне дзеячоў гэтай сыстэмы да права і маральна-этычных вартасьцяў. Калі ты пасьлядоўна ўжываеш да сваіх палітычных супернікаў двайныя стандарты, гэта непазьбежна некалі б'е па табе самім. Таму цалкам выключаць магчымасьць замены Лукашэнкі чалавекам, якому цяпер ад сарака да пяцідзесяці, не выпадае. Праблема не ў Лукашэнку, праблема ў палітычнай культуры, якую ён сымбалізуе, у палітычнай дактрыне, якую ён ажыцьцяўляе — што пасьпяховую мадэрнізацыю краіны можна ажыцьцявіць без апоры на дэмакратычныя інстытуты і пры апірышчы на каляніяльную культурную спадчыну. Такі палітычны курс, незалежна ад таго, ці будзе ён праводзіцца Лукашэнкам або іншым палітыкам, ідзе ўразрэз з маімі ўяўленьнямі пра ідэальную Беларусь.

Гутарыў Барыс Тумар

Арыфмэтыка дыктатуры

Працяг са старонкі 3.

Палітычныя адміністрацыйныя працэсы сталі масавай зьявай. Крымінальных было меней. За 10 гадоў па крымінальных справах, аб палітычным характары якіх заявілі праваабаронцы, прайшлі 55 чалавек. Першымі былі крымінальныя справы Пазьняка і Навумчыка, якім давялося эміграваць з краіны (1996). Тыя справы не дайшлі да суду. Апошнія па часе — супраць эксміністра Міхаіла Марыніча і Валер'я Леванеўскага (сёлета). Абодва працягваюць сядзець.

З рахунку нельга скідаць і іншыя сродкі ціску, дадае праваабаронца Алесь Бяляцкі: «Многіх актывістаў выклікалі ў КДБ, на «гутаркі», сотні былі звольнены з працы (на сёньня практычна ўсіх партыйных актывістаў пазвальнялі), вядомы выпадкі, калі быў ціск на сем'і актывістаў».

Падчас палітычна матываваных працэсаў судзьдзі масава спрашчаюць сабе жыцьцё: не паведамляюць правапарушальнікам пра іхныя правы, не выклікаюць сьведкаў, вядуць працэсы без пратаколу й г.д. Гэта «ня лічыцца патрэбным».

Нягледзячы на гэтую «мэханізацыю рэпрэсій», тысячы людзей кідалі выклік сыстэме. Для лукашэнкаўцаў яны былі «сейбітамі хаосу», для гісторыі яны непазьбежна застануцца фактам масавага негвалтоўнага супраціву.

Аркадзь Шанскі

Маўчаньне травы

Віталь Тарас

Дзесяцігодзьдзе — яшчэ больш умоўны адрэзак гісторыі, чымся, напрыклад, стагодзьдзе. Тым ня менш, здараюцца супадзеньні ў часе, якія нібы самі па сабе вымушаюць праводзіць нейкія паралелі. Дзесяць гадоў таму памёр вялікі правадыр карэйскага народу, горача любімы кіраўнік КНДР таварыш Кім Ір Сэн. Яго месца заняў сын, проста любімы правадыр і кіраўнік Кім Чэн Ір. Такім чынам, дзесяцігодзьдзе перабываньня ва ўладзе Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі супала зь дзесяцігодзьдзем праўленьня таварыша Кім Чэн Іра.

Цікава, што дзесяць гадоў таму маскоўская «Общая газета» пад рэдакцыяй Ягора Якаўлева , зь якой я тады супрацоўнічаў, адмыслова завярстала мой матэрыял пра перамогу Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах у адным блёку з матэрыялам пра Кім Чэн Іра. Ужо тады мала ў каго з журналістаў былі ілюзіі наконт прыроды будучага рэжыму, які зьбіраўся будаваць цалкам дэмакратычна абраны прэзыдэнт Беларусі.

Канечне, адрозьненьні паміж двума рэжымамі былі й ёсьць. Яны відавочныя. Перадача ўлады ў спадчыну ўсё-такі бліжэйшая да сярэднявечнай сыстэмы ўлады, чымся, скажам, рэфэрэндумы. У КНДР, як раней у СССР, ёсьць толькі адна пануючая партыя, лідэр якой адначасова стаіць на чале дзяржавы. Ён і зьяўляецца адзіным і абсалютным, горача любімым народам кіраўніком. У Беларусі ёсьць некалькі партыяў, аднак ніводная не прадстаўлена ў парлямэнце. Але ж галоўны кіраўнік, насамрэч, у краіны таксама адзін. У гэтым сэнсе, калі гаварыць пра парлямэнцкую дэмакратыю, лік ва ўмоўным спаборніцтве паміж Беларусяй і Паўночнай Карэяй застаецца 1:1.

У Беларусі не было таго страшэннага галадамору, які напаткаў паўночных карэйцаў некалькі год таму (наша краіна прайшла праз голад у сярэдзіне 30-х гадоў мінулага стагодзьдзя). Дый травы беларусы не ядуць. У Беларусі, у адрозьненьне ад КНДР, не забаронена прыватнае прадпрымальніцтва. Але пэрыядычна саджаюць прадпрымальнікаў за краты гэтаксама ахвотна, як і ў Паўночнай Карэі. Праўда, там праз адсутнасьць сваіх давялося пасадзіць кітайскага бізнэсоўца, які быў асьмеліўся стварыць з дазволу Пхеньяну свабодную эканамічную зону. Няма, зразумела, нічога супольнага паміж ідэямі Чучхе (адзінства й працьвітаньне карэйскага народу пад мудрым кіраўніцтвам любімых правадыроў) і беларускай дзяржаўнай ідэалёгіяй. Але ж ідэя «апоры на ўласныя сілы», перанятая Пхеньянам у кітайцаў за часамі Мао Цзэдуна, усё больш выразна чытаецца паміж радкамі выступаў галоўнага беларускага аратара.

І, нарэшце, галоўнае. КНДР сёньня застаецца, бадай, адзінай краінай, якая ня толькі выступае супраць палітыкі ЗША, але і адкрыта называе іх ворагам ды нават пагражае атамным бамбаваньнем. Пасьля адхіленьня ад улады Слабадана Мілошавіча й падзеньня рэжыму Садама Хусэйна Менск можа па праву прэтэндаваць на тое, каб заняць ключавое месца на пэўнай геапалітычнай восі. Толькі гэта ня Менск—Масква—Пэкін, аб чым марыў некалі беларускі прэзыдэнт, а Гавана—Менск—Пхеньян. Пхеньян, дарэчы, трэба было б паставіць на першае месца ў гэтым трохкутніку, паколькі толькі Паўночная Карэя мае пэўную колькасьць ядзерных матэрыялаў і патэнцыйную магчымасьць вырабіць ядзерную зброю. Аляксандру Лукашэнку, як і Фідэлю Кастра, застаецца толькі горка шкадаваць з прычыны страчаных магчымасьцяў: Кастра — праз тое, што Саветы вывезьлі свае ракеты з Кубы яшчэ ў 1961-м, Лукашэнку — дзеля вываду расейскіх ракет пасьля распаду СССР.

Некалі Алесь Адамовіч сказаў пра СССР: «Верхняя Вольта з ракетамі». А што калі Савецкі Саюз распадаецца на некалькі Верхніх Волтаў і не ва ўсіх застаюцца ракеты? Насамрэч нічога сьмешнага з гэтага ня выйшла. Бо самыя страшныя віды зброі — гэта імпэрская мэнтальнасьць, прага ўлады й фрустрацыя ўладароў, якая непазьбежна выліваецца ў агрэсіўнасьць. Нядаўні вайсковы парад — чарговая ілюстрацыя да тэмы.

Цяпер шмат гавораць аб тым, што Злучаныя Штаты памыліліся (наўмысна ці не) у ацэнках ваеннага патэнцыялу Іраку, і ў першую чаргу — адносна наяўнасьці зброі масавага зьнішчэньня. Але нельга не згадаць, што Садам Хусэйн рабіў усё магчымае, каб Захад упэўніўся: Ірак мае такую зброю і без ваганьняў ужыве яе ў выпадку нападу праціўніка.

PB

Размовы наконт таго, будзе трэці тэрмін у беларускага кіраўніка ці ня будзе, пазбаўлены ўсялякага сэнсу. 10 гадоў — гэта ўжо бясконцасьць у палітыцы, а ў бясконцасьці межаў няма.

Ва ўмовах канфрантацыі з Захадам Садамава ўлада ўнутры краіны толькі мацавалася. Дзе ў выніку апынуўся Садам — вядома. Невядома толькі, якім будзе ягоны лёс і як павернецца далейшая гісторыя Іраку. Дый ЗША — таксама.

Калі былы прэзыдэнт Югаславіі Мілошавіч быў арыштаваны як ваенны злачынец, многія думалі, што Сэрбія хутка павернецца тварам да Захаду. Потым было забойства лідэра сэрбскіх дэмакратаў прэм'ера Джынджыча, шмат іншых невясёлых падзей. Сэрбія й Чарнагорыя ўсё яшчэ застаюцца далёкай ад інтэграванай Эўропы. А Мілошавіч і цяпер знаходзіцца пад трыбуналам, і заканчэньня працэсу над ім не відаць.

Але тут мы падыходзім ужо да зусім іншай праблемы: што рабіць з дыктатарамі пасьля дыктатуры? Камусьці здаецца, што лёс Хусэйна, Мілошавіча, а да гэтага Пінаchэта, а яшчэ раней — кіраўнікоў гітлераўскага Райху павінен паслужыць урокам для дыктатараў і ваенных злачынцаў ва ўсім сьвеце. Хачу ў гэтай сувязі згадаць назву кнігі выдатнага польскага публіцыста Караля Малцужынскага, які прысутнічаў на Нюрнбэрскім працэсе і напісаў пра яго вынікі. Кніга называлася «Злачынцы ня хочуць прызнаць сваёй віны». Заўважце, не «Трыюмф юстыцыі», не «Злачынства й пакараньне», не які-небудзь «Нюрнбэрскі эпілёг», урэшце. Аўтар проста канстатаваў: «Гітлераўскія злачынцы ня хочуць прызнаць сябе вінаватымі ні ў чым». І ў гэтым сутнасьць справы. Ні Хусэйн, ні Мілошавіч вінаватымі сябе ня лічаць. Наадварот, яны самі абвінавачваюць і, як ім здаецца, выкрываюць сваіх ворагаў у судзе. Што ж казаць пра тых дыктатараў, якія яшчэ на свабодзе? Напэўна, і Чаўшэску напярэдадні перавароту здавалася, што ён будзе кіраваць румынамі яшчэ вельмі доўга. Ніхто з дыктатараў яшчэ не адмаўляўся ад улады добраахвотна — толькі пад узьдзеяньнем грубай сілы, знадворнай або ўнутранай.



AP

Ні Хусэйн, ні Мілошавіч вінаватымі сябе ня лічаць. Яны самі абвінавачваюць і выкрываюць сваіх ворагаў у судзе.

Таму ўсе размовы наконт таго, будзе трэці тэрмін у беларускага кіраўніка ці ня будзе, пазбаўлены ўсялякага сэнсу. 10 гадоў — гэта ўжо бясконцасьць у палітыцы, а ў бясконцасьці межаў няма. Калісьці праўленьне Брэжнева здавалася бясконцым, а яно цягнулася ўсяго 17 год. Гітлер быў ва ўладзе ўсяго дванаццаць. Але, з другога боку, былі Франка й Салязар. Абодва кіравалі доўга й памерлі сваёй сьмерцю. Сваёй сьмерцю памерлі Сталін (праўда, тут у гісторыкаў ёсьць сумненьні) і Мао Цзэдун, Гейдар Аліеў, а таксама згаданы ўжо напачатку Кім Ір Сэн. Дарэмна было б шукаць тут нейкіх заканамернасьцяў. У дыктатараў, як і ў краін, бывае розны лёс. Адзінае, што не выклікае сумневу, дык гэта тое, што галоўным саўдзельнікам злачынстваў рэжыму выступае сам народ — да таго часу, пакуль ён захоўвае маўчаньне.

REUTERG

Сэрбія й Чарнагорыя ўсё яшчэ застаюцца далёкімі ад інтэграванай Эўропы.

I.TIMEINC.NET

Дзесяцігодзьдзе перабываньня ва ўладзе Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі супала зь дзесяцігодзьдзем праўленьня таварыша Кім Чэн Іра.

Віктары і вэктары

Юшчанка супраць Януковіча

Леанід Кучма не зьбіраецца парушаць канстытуцыйную норму, якая абмяжоўвае прэзыдэнцтва двума тэрмінамі.
3 ліпеня ва Ўкраіне афіцыйна пачалася кампанія па выбарах прэзыдэнта, якія адбудуцца 31 кастрычніка. Шанцы на перамогу маюць толькі два кандыдаты: экс-прэм'ер, лідэр апазыцыйнага выбарчага блёку «Сіла народу» Віктар Юшчанка і цяперашні прэм'ер-міністар, кандыдат ад Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч.

WWW.RAZOM.ORG.UA

Юшчанку выпраўлялі ў прэзыдэнты жонка, дачка і прыхільнікі пад аранжавымі сьцягамі.

З блаславеньня маці

Паводле зьвестак сацыёлягаў, Віктар Юшчанка на сёньня мае падтрымку 24% выбарцаў — ён лідэр сярод кандыдатаў. 3 ліпеня Юшчанка разам зь сям'ёй наведаў сваю родную вёску Харужаўка Сумскай вобласьці. Сваю кампанію ён пачаў з блаславеньня сваёй 85-гадовай маці на змаганьне за пасаду кіраўніка краіны. «Няхай Бог дапаможа табе ў тваіх добрых справах», — сказала Варвара Юшчанка свайму сыну, перахрысьціўшы яго.

Прылюдна пра сваё рашэньне змагацца за прэзыдэнцкую пасаду Віктар Юшчанка абвясьціў 4 ліпеня на Пеўчым полі ў Кіеве, дзе сабраліся дзясяткі тысяч ягоных прыхільнікаў з усіх рэгіёнаў Украіны. Выбарчы штаб лідэра «Нашай Украіны» сьцьвярджаў, што падтрымаць першы крок Віктара Юшчанкі ў прэзыдэнцкіх выбарах прыехалі 100 тысяч прадстаўнікоў з усіх 35000 акругаў краіны. Паводле іншых ацэнак, іх было ўдвая меней, але ўсё адно гэтая акцыя нагадала ўсім часы змаганьня за незалежнасьць на пачатку 90-х. Перад пачаткам мітынгу сваю падтрымку Юшчанку засьведчыў шэраг знаных ва Ўкраіне сьпевакоў, у тым ліку «Воплі Відаплясава» ды «Океан Ельзи».

«Віру, знаю — можемо»

Прамаўляючы перад шматтысячным сходам, Юшчанка паабяцаў, што ў выпадку яго абраньня Ўкраіна стане некарумпаванай эўрапейскай дзяржавай, а кожны чалавек атрымае магчымасьць годнага жыцьця: «Карупцыі будзе пакладзены канец. Бандыты будуць сядзець у турмах. Я прашу ў Бога ласкі й любові для Ўкраіны. Я выйграю выбары. Гэта будзе перамога нас усіх». З поля пад гукі казацкага маршу Віктар Юшчанка ў суправаджэньні шматтысячнага натоўпу, што запоўніў некалькі кіеўскіх вуліц, рушыў да Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Лёзунгам Юшчанкавай кампаніі стала выслоўе «Веру, ведаю — можам». Кіраўнік ягонага штабу Аляксандар Зінчанка (былы кіраўнік тэлеканалу «Інтэр», адпаведніка нашага АНТ, яшчэ год таму — зацяты апанэнт Юшчанкі) так расшыфраваў гэты слоган на мітынгу 4 ліпеня: «Я веру! Паглядзеце ў Юшчанкавы вочы. Ці ёсьць сумненьні, што ён верыць?! Ён верыць у Бога, сваіх бацькоў, ва Ўкраіну. Я ведаю! Гэта чалавек, што кіраваў Нацыянальным банкам і ўрадам. А вы ведаеце, якім прэм'ер-міністрам ён быў? Мы можам! Усё залежыць ад нас! 31 кастрычніка мы станем сьведкамі падзеі, якую ў сучаснай гісторыі можна параўнаць хіба што з набыцьцём незалежнасьці ў 1991 г.».

Папярэдне Юшчанка падпісаў пагадненьне аб стварэньні кааліцыі «Сіла народу» з прадстаўніцай радыкальнага крыла апазыцыі Юліяй Цімашэнкай. Навастораны хаўрус у сваім «Маніфэсьце народнай перамогі» дэкляруе, што ў выпадку перамогі на выбарах «ачысьціць Украіну ад крымінальных кланаў і палітычнага бандытызму» ды за пяць год «ператворыць Украіну ў заможную, дэмакратычную дзяржаву — будучага лідэра цэнтральнаэўрапейскага рэгіёну». Падзел пасадаў у будучым урадзе? Паводле колькасьці галасоў, пададзеных за асобных удзельнікаў кааліцыі на парлямэнцкіх выбарах.

Два праекты

Старшыня Кабінэту міністраў Віктар Януковіч разьлічвае на падтрымку ўсходу краіны і адміністрацыйны рэсурс. Ён цешыцца неадрыўнай увагай з боку афіцыйных тэлеканалаў. Вэб-сайт «Украінская праўда» працытаваў два т.зв. «тэмнікі» — непадпісаныя інструкцыі, што рэгулярна дасылаюцца ў дзяржаўныя СМІ. У іх журналістам настойліва раяць абмяжоўваць асьвятленьне кампаніі Юшчанкі просьценькімі паведамленьнямі і не даваць ніякіх камэнтароў.

Адначасова рэкамэндуецца зьвярнуць увагу на нядаўна выдадзеную кніжку, аўтар якой, «былы падатковы інспэктар сярэдняга зьвяна», між іншым, абвінавачвае Юшчанку ў крадзяжы «мільёнаў даляраў» зь дзяржаўнай казны ў 1991—92 г.

Прэзыдэнт Кучма яшчэ ў сьнежні ці то перасьцярог, ці то пагрозьліва паабяцаў, што гэтыя выбары будуць найбруднейшымі ва ўсёй гісторыі Ўкраіны. Сёлетняя кампанія, якая закончыць дзесяцігадовую эру Леаніда Кучмы, вылучаецца яшчэ й тым, што ўпершыню прадстаўнік Кампартыі ня мае шанцаў выйсьці ў другі тур.

Выбары стануць, такім чынам, чарговым раўндам змаганьня паміж рознымі праектамі дзяржавабудаўніцтва — постсавецкім, які адстойвае цяперашні рэжым, ды нацыянальна-дэмакратычным, які ўвасабляе «Наша Ўкраіна». І гэта сапраўды лёсавызначальны выбар паміж двума вэктарамі разьвіцьця краіны.

Беларуса ў прэзыдэнты

Прэм'ер-міністра Віктара Януковіча падтрымліваюць 16% выбарцаў. Ён быў вылучаны кандыдатам на зьезьдзе Партыі рэгіёнаў, які прайшоў у Запарожжы 4 ліпеня. Падзея адбывалася ў Палацы культуры заводу «Дняпроспэцсталь». Выступала група «Жасмин» з старымі тухманаўскімі шлягерамі, іх зьмяняў шаўчэнкаўскі «Реве та стогне» з казацкім гапаком.

«Маё жыцьцё належыць народу Ўкраіны», — пад такім крэольскім лёзунгам Віктар Януковіч зьбіраецца змагацца за пасаду кіраўніка дзяржавы. Дарэчы, продкі данбасца Януковіча — беларусы, з-пад Докшыцаў. Калі ўлічыць, што й Кучма паходзіць зь беларускамоўнага раёну Чарнігаўшчыны, ва ўладзе можа аказацца сапраўдная беларуская дынастыя. Януковіч размаўляе паўкраінску лепш, чым Кучма.

Янукевічавы абяцаньні выбарцам больш сьціплыя, чымся эўрапейскія дэклярацыі Юшчанкі: цяперашні прэм'ер абяцае змагацца за працьвітаньне Ўкраіны, павышэньне заробкаў, супраць высокіх падаткаў, карупцыянэраў, чыноўніцкага бязьмежжа…

Сацыяліст Мароз і камуніст Сіманенка былі вылучаны на зьездах сваіх партый, якія прайшлі ў Кіеве 4 ліпеня. Левыя партыі заклікалі адна адну да правядзеньня супольнай кампаніі, але пры тым сацыялісты ўхіліліся ад выказваньня падтрымкі камуністычнаму кандыдату, пакідаючы сабе магчымасьць падтрымаць Юшчанку, які ўжо выказваў сваю зацікаўленасьць у тым.

Шанцы добрыя, бракуе веры

Падтрымка кандыдатаў розная ў розных рэгіёнах краіны. Паводле дадзеных апытаньняў, што пачынаючы зь сярэдзіны мінулага году, ладзіць блізкі да кучмістаў Кіеўскі міжнародны інстытут сацыялёгіі, сярод насельніцтва гарадоў колькасьць прыхільнікаў Юшчанкі і Януковіча прыблізна роўная — каля 30%. Сярод вяскоўцаў прыхільнікаў удвая больш у Юшчанкі (каля 50%), тады як Януковічу свае галасы аддадуць 21—24%.

У рэгіянальным пляне Юшчанку цьвёрда падтрымліваюць на захадзе, дзе жыве 20% выбарцаў (70% супраць 10—12%, якія мае там Януковіч). На ўсходзе, дзе жыве 21% электарату, усё наадварот: 60% у Януковіча і 11—13% у Юшчанкі. Цэнтральная Ўкраіна (24% электарату) таксама падтрымлівае Юшчанку (42—45% супраць 18—21% у Януковіча), а на поўдні (19% насельніцтва) больш прыхільнікаў мае Януковіч (31—34% супраць 18—23% у Юшчанкі).

Міхаіл Паграбінскі, дырэктар Кіеўскага цэнтру палітычных дасьледаваньняў і канфліктaлёгіі, адзначае, што можна казаць пра стабільнасьць гэтых суадносінаў. Калі рэйтынг Януковіча паволі расьце, то Юшчанка за апошнія два гады шэрагаў сваіх прыхільнікаў не павялічвае. Гэта азначае, што па перамогу яму прыйдзецца ісьці да новых людзей і пераконваць іх, перш за ўсё зьвярнуўшыся да ўсходняга і паўднёвага рэгіёнаў.

Юшчанку давядзецца змагацца і зь нявер'ем. За Януковіча цяпер хочуць галасаваць 16% выбарцаў, але вераць у ягоную перамогу ўдвая больш — прыкладна 36%. За Юшчанку жадаюць аддаць галасы 24%, але вераць у яго перамогу толькі 17%. Цікава, што разьмешчаная каля Цэнтравыбаркаму букмэкерская кантора «Фаварыт» ня лічыць Юшчанку фаварытам выбараў ды прымае стаўку на яго перамогу з каэфіцыентам 2,9, тады як на Януковіча — 1,5, і нават на «любога іншага кандыдата» — 2,5.

Сяргей Радштэйн

WWW.NATO.INT

Робэртсан запрашаў Януковіча ў NATO… На здымку — сустрэча ў штаб-кватэры Альянсу ўвесну мінулага году.

Канстанцін Касачоў: Расея не выключае сяброўства Беларусі ў ЭЗ

Старшыня камітэту Думы Расеі па міжнародных справах і адзін зь лідэраў прапуцінскай партыі і «Адзінай Расеі» Канстанцін Касачоў даў інтэрвію найбуйнейшай газэце Швэцыі «Dagens Nyheter». Сярод іншага было сказана, што Расея не выключае будучага сяброўства Беларусі (як і Ўкраіны ды Турцыі) у Эўразьвязе.

Разам з тым, Касачоў паведаміў, што Расея ніколі не падасьць заяўкі на кандыдацтва ў ЭЗ, бо абавязкова прыйдзе «адмова», а гэта кепска для іміджу Расеі. Тым ня менш, Касачоў не сумняваецца, што, калі б ЭЗ запрасіў Расею ў свае шэрагі, Расея прыйшла б да адпаведнасьці стандартам ЭЗ «вельмі хутка», але, хутчэй за ўсё, паводле слоў Касачова, Расея застанецца па-за ЭЗ і будзе разам з ЗША, Кітаем і Японіяй адыгрываць ролю неэўрапейскіх вялікіх дзяржаў.

АК, Стакгольм

У Лакцяны да Стаповіча

26—27 чэрвеня ў Лакцянах на Астравеччыне з нагоды 110-годзьдзя з дня нараджэньня Альбіна Стаповіча сабралася грамада на пяць дзясяткаў чалавек — ушанаваць памяць славутага ксяндза, адсьвяткаваць Купальле і проста сустрэцца сяброўскім колам.

Натхняльнікам і рэжысэрам сустрэчы сталі краязнавец Алесь Юркойць і сябры суполкі «Вільняр».

Альбін Стаповіч (Стэповіч), брат вядомага Казімера Сваяка, выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі, быў загадчыкам друкарні імя Скарыны, быў сярод заснавальнікаў Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры. У 1927—30 гадах зьяўляўся віцэ-старшынём Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі і выдаўцом яе друкаванага органу — «Беларускай крыніцы», быў дэпутатам польскага сойму. Да сканчэньня зямнога жыцьця (18 сьнежня 1934) Альбін Стаповіч працаваў кіраўніком беларускага хору пры касьцёле Сьв.Мікалая ў Вільні.

У роднай вёсцы Стаповічаў і цяпер стаіць старэнькая бацькоўская хатка, якая выпусьціла ў шырокі сьвет братоў. Менавіта ў ёй суботнім ранкам сабраліся госьці. Аповед пачала дасьледчыца жыцьця Стаповіча, вядомая гістарыца з Гданьску Алена Глагоўская. Удзячныя словы гучалі з вуснаў сваякоў Стаповіча — прафэсара Вітаўта Юрыя Стаповіча з Гданьску і яго сына, што ўпершыню прыехалі на радзіму продкаў. Пры канцы сьпяваў выдатны хор студэнтаў Акадэміі музыкі. На сьцены хаткі была замацавана памятная шыльда, прысьвечаная братам Стаповічам. Найбольш актыўныя ўдзельнікі гэтага і леташняга мерапрыемстваў былі ўганараваны пачэснымі званьнямі «дзядзька» і «цётка», «друг», а рэшта стала «шыхтавымі». Пасьля грамада вярнулася да возера, дзе ля вогнішча была пастаўлена сіламі ахвотных містэрыя Альбіна Стаповіча.

У нядзелю прайшоў канцэрт, дзе вёў рэй хор сп.Насаева і браў удзел вядомы бард Зьміцер Бартосік разам з Андрэем Карповічам.

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, якое сваімі несупыннымі залевамі намагалася перапыніць мерапрыемства, сустрэча на гасьціннай зямлі Астравеччыны прайшла як найлепш. Годная традыцыя захаваная і падтрыманая.

Усевалад Сьцебурака

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У Беларусі аднаўляецца сьвецкае жыцьцё. Вясельле Максіма Мірнага й Ксені Рубчэні, якое адбылося ў Менску мінулымі выходнымі, суправаджалася салютам, выпусканьнем галубоў і гуляньнем у "Журавінцы". Даеш больш вясельляў нацыянальнага значэньня!

Дэпутат ад БНФ адстойвае выбаршчыкаў

Юрась Зянковіч, дэпутат Менскага райсавету, накіраваў два звароты ў выканаўчыя структуры. Адзін запыт скіраваны ў раённы аддзел адукацыі. Дэпутат просіць растлумачыць, чаму з 1 чэрвеня настаўнікам перасталі выплачваць камандзіровачныя. Паводле Зянковіча, рашэньне аб спыненьні выплат супярэчыць Працоўнаму кодэксу і некаторым падзаконным актам. Да Ю.Зянковіча з просьбай разабрацца ў сытуацыі зьвярнуліся настаўнікі зь ягонай выбарчай акругі. Другі зварот на імя старшыні Менскага райвыканкаму накіраваны з прычыны шматлікіх парушэньняў пры будаўніцтве жылога дому ў Ждановічах. «Зварот да дэпутата для людзей — апошняя надзея», — кажа Ю.Зянковіч.

АШ

Мастак-пераможца

Баранавіцкі мастак Алесь Фалей заняў першае месца на міжнародным біенале графікі ў Пецярбурзе. Пасьля перамогі мастак атрымаў мноства прапаноў на выставы сваіх работ зь Літвы, Расеі.

Руслан Равяка, Баранавічы

Шагала віталі ў Полацку

9 ліпеня ў рамках Шагалаўскіх чытаньняў, якія ладзіліся ў Віцебску, у полацкай мастацкай галерэі адбылося адкрыцьцё выставы «Марк Шагал і мастакі эўрапейскага авангарду». Побач з шагалаўскімі творамі былі выстаўлены працы Аны Матыса, Пабла Пікаса, Фэрнана Лежэ і іншых. Усе гэтыя карціны належаць Віцебскаму музэю Марка Шагала — у розныя часы яны былі падараваныя роднаму гораду славутага майстра калекцыянэрамі мастацтва са Швайцарыі, Нямеччыны і Францыі, а таксама сваякамі мастака. На адкрыцьці выставы прысутнічала ўнучка Шагала Мэрэт Мэер-Грабэр.

Полацак вяртае свае бажніцы

Сёлета ў Полацку стане на адзін храм болей: побач са старым мостам церазь Дзьвіну аднаўляецца Сьвята-Пакроўская царква. Гэты храм ня значыўся ў шэрагу найбольш адметных полацкіх бажніцаў, але лёс склаўся так, што адбудова зруйнаванага ў Полацку пачалася менавіта зь яго. Ініцыятарам аднаўленьня стаў стары полацкі сьвятар Міхаіл Уляхін. Ён пачаў справу практычна безь якога-кольвечы ўзгадненьня з уласным кіраўніцтвам — адшукаў архітэктара, які зрабіў праект, самастойна зьбіраў сродкі на будаўніцтва (нават хадзіў са скрынкаю па полацкім кірмашы), угаварыў кіраўніцтва будтрэсту № 22 уключыць у свае пляны аб'ект, які ня меў сталай крыніцы фінансаваньня. Адбывалася гэта ў сярэдзіне 90-х. На грошы, якія сабраў Міхаіл, будаўнікі здолелі закласьці толькі падмуркі, і будоўля спынілася. Полацка-Глыбоцкая епархія была ня вельмі зацікаўлена ва ўзьвядзеньні Сьвята-Пакроўскай царквы. Найперш не задавальняла яе месца знаходжаньня: на гэтай жа вуліцы, крыху ніжэй, месьціцца Богаяўленскі сабор. Новую царкву варта было будаваць у новых мікраёнах — Марыненка або Аэрадром. Пяць гадоў падмуркі мулялі вочы кіраўніцтву. Урэшце быў створаны адмысловы штаб, які ачоліў старшыня гарвыканкаму Ўладзімер Тачыла, — пасяджэньні яго адбываліся штотыдзень. І вось будаўніцтва набліжаецца да завяршэньня. 28 чэрвеня на стройпляцоўку прывезьлі незвычайны груз – тры званы, адлітыя менскай фірмай «Выдатнае ліцьцё». Самы большы важыць 330 кг.

Новыя касьцёлы

27 чэрвеня ў вёсцы Блізьніца Полацкага раёну асьвяцілі новую капліцу. Блізьніца — цэнтар былога калгасу-мільянэра імя Сільніцкага (цяпер СПК імя Сільніцкага). У сярэдзіне 90-х у Блізьніцы за аўстрыйскія грошы быў пабудаваны прыватны мясны міні-завод. Гэта добра адбілася на дабрабыце мясцовых жыхароў. І вось у вяскоўцаў-каталікоў зьявіўся і свой невялічкі касьцёл.

А ў гэтую нядзелю, 11 ліпеня, адбудзецца асьвячэньне касьцёлу ў мястэчку Ветрына Полацкага раёну. Мястэчка гэтае стаіць на шляху Полацак — Вільня, у мінулым яно было і цэнтрам воласьці, і райцэнтрам. У 1995 г. у Ветрыне ў перабасталяваным клюбе была адкрыта праваслаўная царква. Касьцёл, хоць і невялічкі, пабудавалі на «роўным месцы». Сёлета мястэчка будзе адзначаць сваё 500-годзьдзе.

У гонар полацкіх пакутнікаў

10 ліпеня ў Полацку сустракалі грэка-каталіцкую пілігрымку, якая пяць дзён ішла зь Віцебску ў старажытную крывіцкую сталіцу. Гэта ўжо дзясятая пілігрымка ў гонар полацкіх пакутнікаў, закатаваных служкамі расейскага цара Пятра I у храме Сьв.Сафіі. Сёлета таксама спаўняецца дзясятая гадавіна дзейнасьці манахаў-студытаў у Полацку. У шлях да полацкай Сафіі ад Усьпенскай горкі ў Віцебску выправіліся блізу 130 уніятаў з розных куткоў Беларусі і некалькі паломнікаў з Украіны. Па традыцыі ў полацкай пілігрымцы ўзяў удзел кіраўнік усіх супольнасьцяў манахаў Студыцкага закону айцец Бэнэдыкт. Ён быў адным са стваральнікаў полацкай грэка-каталіцкай грамады, а таксама пад яго кіраўніцтвам была пабудавана царква Сьв.Параскевы Полацкай (на здымку).

Пілігрымы а 17-й прыйшлі да Сафіі. На наступны дзень урачысты малебен быў наладжаны побач з царквой Сьв.Параскевы.

Васіль Кроква, Полацак

Знак на Куцейне

З ініцыятывы Фонду аховы помнікаў гісторыі і культуры ў Воршы распачатая акцыя «Страчаныя сьвятыні». У яе рамках плянуецца адзначыць мэмарыяльнымі знакамі месцы, дзе некалі знаходзіліся цэрквы, касьцёлы, сынагогі. Першы такі знак у памяць Сьвята-Ўсьпенскага Куцеінскага манастыра ўсталяваны пры канцы чэрвеня на тэрыторыі школы №20. Гэты праваслаўны манастыр быў заснаваны ў 1631-м мсьціслаўскім падкамор'ем Багданам Статкевічам-Завірскім і ягонай маці княгіняй Ганнай Агінскай. Цудадзейны абраз Казанскай Божай Маці, што захоўваўся ў манастыры, згадваў Караткевіч у «Каласах пад сярпом тваім». Ён быў узорам, зь якога пісалі абразы «Прыгажосьць невыказная».

У 1918 г. бальшавікі гвалтоўна зачынілі манастыр. У гады вайны тут быў створаны лягер сьмерці. Будынкі канчаткова зруйнавалі ў 1950-я. Апошняя згадка пра манастыр прыпадае на другую палову 1980-х, калі пры будаўніцтве шматпавярховак на вуліцы Флёрава адкапалі сутарэньні саборнага храму.

Чорная гранітная пліта з выявай манастыра (з фота пачатку XX ст.) і памятным тэкстам (напісаным літарамі выданьняў, што друкаваліся ў суседнім Багаяўленскім Куцеінскім манастыры) дабрачынна зробленая на прыватным прадпрыемстве Мікалая Дземчанкі. Побач зь ёй усталяваны валун, прыцягнуты вучнямі школы з рэчышча даўно абмялелай рэчкі Куцеінкі. Магчыма, гэта камень з падмуркаў аднаго з манастырскіх храмаў, бо на ім захаваліся сьляды вапны.

Віктар Лютынскі, Ворша

ХРОНІКА

Заснавальнік недзяржаўнай «Местной газеты» (Ваўкавыск) Андрэй Шантаровіч атрымаў 7 ліпеня патрабаваньне ад пажарнай аховы зрабіць комплексны рамонт памяшканьня да 5 жніўня або высяляцца. 7 ліпеня Барысаўскі гарадзкі суд адмовіў **прадстаўнікам дэмакратычных партый** у скарзе на гарвыканкам: чыноўнікі чатыры разы адмаўлялі ў дазволе на правядзеньне мітынгу пад сацыяльна-эканамічнымі лёзунгамі, матывуючы гэта памылкамі ў афармленьні заявак. Прадстаўнікі Салігорскага райвыканкаму 8 ліпеня не дазволілі **сябрам КХП-БНФ** усталяваць драўляны крыж у мястэчку Чырвоная Слабада (раней Вызна) у гонар Слуцкага збройнага чыну. 9 ліпеня галоўны рэдактар газэты «День» **Мікола Маркевіч** накіраваў у Гарадзенскі аблсуд скаргу на рашэньне Ленінскага раённага суду Горадні — за ўзаконеную канфіскацыю накладу газэты й штраф «за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак». Маркевіч таксама абскарджвае па касацыі рашэньне гаспадарчага суду Гарадзенскай вобласьці, паводле якога грамадзкае аб'яднаньне «Бацькаўшчына» й гарадзкую арганізацыю Таварыства беларускай мовы маюць выселіць з памяшканьняў. Судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Леанід Ясіновіч 12 ліпеня падоўжыў тэрмін утрыманьня **Міхаіла Марыніча** ў СІЗА КДБ, адхіліўшы скаргу абароны на незаконнае ўтрыманьне пад вартай. 12 ліпеня тэрмін утрыманьня пад вартай **Валер'я Леванеўскага** падоўжаны яшчэ на месяц, да 15 жніўня. Гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці 12 ліпеня ўзяў бок слонімскага **ГА «Воля да разьвіцьця»** ў судзе з падатковай інспэкцыяй у справе падаткаў з праграмы TACIS. Разгляд пазову Міністэрства юстыцыі па ліквідацыі **Беларускай партыі працы**, які меўся пачацца 12 ліпеня, перанесены на 30 ліпеня. Актывістка «Зубра» **Наста Васіленка** затрымана 12 ліпеня падчас распаўсюду газэты «Освобождение». Суд Першамайскага раёну Менску 12 ліпеня адмовіў **Партыі БНФ** у тым, каб распачаць грамадзянскую справу паводле пазову да Белтэлерадыёкампаніі і журналіста Юр'я Пракопава за паклёпніцкія выказваньні ў адрас партыі. Суд палічыў, што ПБНФ ня мае дзелавой рэпутацыі, якую абразілі БТ і Ю.Пракопаў, бо яе маюць толькі суб'екты гаспадараньня. Актывістцы АГП **Людміле Гразновай** 13 ліпеня аддзел пашпартна-візавай службы Партызанскага раёну забараніў выяжджаць за мяжу: яна была аштрафаваная на 2000 даляраў за ўдзел у сёлетнім Чарнобыльскім шляху, але штрафу не сплаціла — аспрэчвае прысуд у Вярхоўным судзе.

АШ

Парадоксы рынку нерухомасьці

адлюстроўваюць сацыяльныя працэсы эпохі позьняга Лукашэнкі

У буйных гарадах значны адсотак насельніцтва — выхадцы зь сяла, якіх карэнныя месьцічы пагардліва называюць «калхозьнікамі». Называй як хочаш, але гэтая праслойка працягвае прырастаць новымі мігрантамі. Вёска згасае за кошт перамяшчэньня працаздольнага насельніцтва ў гарады. Але сапраўдныя маштабы гэтай зьявы можна ацаніць толькі пры аглядзе рэгіянальных рынкаў нерухомасьці.

Гульні дарослых прадпрымальнікаў

Было б няслушна сьцьвярджаць, што ў Беларусі рынак нерухомасьці нецывілізаваны. Існуе толькі купка рыэлтарскіх кантор, якая ціха гуляе паміж сабою на нейкай імправізаванай пазабіржавай пляцоўцы, накшталт таго піўняка, дзе зьбіраліся першыя нью-ёрскія брокеры.

Выбуховы ўздым кошту жытла ў Менску можна растлумачыць досыць лёгка. Калі ў нармальнай сусьветнай практыцы агенцтва нерухомасьці пасьля заключэньня дагавору ацэньвае аб'ект і прадае яго, кладучы сабе ў кішэнь 5—6% камісійных, у беларускім рыэлтынгу звычайна пачынаюць «канструктыўны дыялёг» з уласьнікам жытла, якое прадаецца, з абяцанак прадаць нерухомасьць па найдаражэйшай цане. Рэальны кошт аб'екту не цікавіць ані прадаўца, ані агенцтва. Вядома, зьверху яшчэ накідваюцца камісійныя, у выніку гэтыя фактары і ўплываюць на рост цаны.

У сваю чаргу, прадавец не жадае афармляць эксклюзіўны дагавор з канкрэтным рыэлтарам. У выніку агенты становяцца ахвярамі ўласнай некампэтэнтнасьці, прапанова ёсьць, попыту няма, а цэны проста шалёныя.

Паводле афіцыйных зьвестак, сярэдні заробак «чыстымі» ў краіне — каля 130 даляраў. Мінімальны кошт пакою ў менскай камуналцы на гарадзкой ускраіне, недзе ў Заводзкім раёне ці, напрыклад, у хрушчобах якой-небудзь «Розачкі», — 5 тыс. даляраў. Сярэднестатыстычнаму жыхару Беларусі давядзецца зарабляць на такі мінімальны варыянт сталічнага жытла больш за тры гады, пры ўмове таго, што ён жыве ва ўласнай хаце, ня плаціць за камунальныя паслугі і корміцца са сваёй гаспадаркі. А ў пераважнай большасьці выпадкаў нават пакою ў менскай камуналцы сярэдняму беларусу ня ўбачыць як сьвіньні неба.

Тады хто ж засяляецца ў новыя менскія кватэры? Паводле неафіцыйнай інфармацыі, ня менш за 60% зьдзелак прыпадае на розныя віды абмену. Часьцей за ўсё гэта альбо абмен жытла з горшага на лепшае з даплатай, альбо пераезд з рэгіёнаў у Менск. Другі варыянт, нягледзячы на галечу беларускіх рэгіёнаў, дастаткова папулярны, бо звычайна вялікай вясковай сям'і ёсьць што абмяняць на аднапакаёўку на ўскраіне Менску: людзі гатовы аддаць усё нажытае імі і продкамі, каб толькі вырвацца зь вёскі і пачаць у сталіцы новае, як яны мяркуюць, жыцьцё.

Гарады-спадарожнікі ці гарады-паразыты?

Побач з рынкам жылой нерухомасьці Менску апошнім часам сталі ўзьнікаць міні-рынкі жытла менскіх прыгарадаў. Часьцяком некаторыя населеныя пункты, якія ўжо неафіцыйна атрымалі статус спадарожнікаў сталіцы, немагчыма аднесьці нават да бліжэйшай Меншчыны, ня тое што да прыгараднай зоны. Прыгарадамі звычайна лічыліся такія гарады й мястэчкі Менскага раёну, як Ждановічы, Заслаўе, Міханавічы, Калодзішчы, Гатава й г.д. Мястэчкі накшталт Лашанаў, Самахвалавіч, Паперні, нягледзячы на прыналежнасьць да Менскага раёну, ужо лічыліся ня вельмі прэстыжнымі месцамі жыцьця. Цяпер сытуацыя рэзка зьмянілася.

Узьлёт цэн на жыльлё Менскага раёну пачаўся недзе з восені мінулага году. Відавочна, гэта было зьвязана з тым, што кошт жытла ў сталіцы ўжо дайшоў на той момант ня тое што да высокіх, а проста да абсурдных лічбаў. Для многіх, хто плянаваў пакупку жыльля ў Менску або абмен на Менск, гэтая мара стала недаступнай. Таму ўвага патэнцыйных пакупнікоў пераключылася на навакольле сталіцы.

У рэзультаце адбылося некаторае зьмяшчэньне прыярытэтаў. Ждановічы, Калодзішчы, Сосны сталі фактычна лічыцца часткамі Менску. Нерухомасьць Заслаўя й Гатава па цане наблізілася да менскай. Возьмем, напрыклад, Заслаўе. У ліпені—жніўні мінулага году яшчэ можна было набыць аднапакаёўку ў цэнтры гэтага гарадка за 12—13 тыс. даляраў. Цяпер жа столькі каштуе маласямейка ў Дзехнаўцы — на ўскраіне гораду. Сярод катэджнай нерухомасьці пакуль яшчэ сустракаюцца варыянты недабудаваных «каробак», бывае, што нават з гатовым дахам, за 8—10 тыс. даляраў. Але гэта ўсё часова.

Наколькі адпавядаюць такія цэны, так бы мовіць, «рангу» населеных пунктаў? У тым жа самым Заслаўі ўзровень разьвіцьця інфраструктуры ня вельмі высокі. У горадзе няма функцыянальнага рынку: на ім гандлююць пераважна кабардзінцы і азэрбайджанцы. Ёсьць толькі адзін пункт абмену валюты. Транспарт па горадзе ходзіць нерэгулярна. Асноўным спосабам транспартнай сувязі зь Менскам застаецца электрычка. Аднак кошт жыльля расьце.

Няцяжка здагадацца, што людзі купляюць жытло ў такіх гарадах, як Заслаўе, з разьлікам на працу ў Менску. Для гэтага яны гатовыя кожную раніцу затрачваць на дарогу да месца працы гадзіну, калі ня болей. Для чалавека, які нарадзіўся й гадаваўся ў правінцыі, гэта раўназначна выхаду ў адкрыты космас. Між тым, людзі на працу ў Менск езьдзяць ня толькі зь Менскага раёну. Досыць папулярнай стала нерухомасьць у Койданаўскім раёне — гарадах Койданава (Дзяржынск) і Фаніпаль. Нягледзячы на тое што электрычкі ходзяць да Менску рэгулярна, а з Фаніпалю, напрыклад, ня менш рэгулярна курсіруюць маршруткі, гэта ўсё ж ня Менск. Прапіска — ня менская, нумары тэлефонаў — ня менскія. Але жыхароў гэтых мясьцін, якія працуюць у сталіцы, становіцца ўсё больш і больш, нягледзячы на дыскрымінацыйную палітыку менскіх уладаў. Тым жа тлумачацца высокія цэны на кватэры ў Рудзенску і Дружным (Пухавіцкі раён). Як вядома, недалёка знаходзіцца Гатава (Менскі раён), дзе знайсьці працу на фабрыцы нашмат лягчэй, чым нават у Мар'інай Горцы.

Працяг на старонцы 11.

FOTO.BYMEDIA.NET

Мінімальны кошт пакою ў менскай камуналцы ў хрушчобах якой-небудзь "Розачкі" — 5 тыс. даляраў.

Ждановічы, Калодзішчы, Сосны сталі лічыцца часткамі Менску. Нерухомасьць Заслаўя й Гатава па цане наблізілася да менскай. Мястэчкі накшталт Лашанаў, Самахвалавіч, Паперні выйшлі на рынак.

У Маладачанскім раёне рыэлтары лічаць нармальнымі вёскі з 5—10 кінутымі дамамі.

У краіне расьце прорва паміж эканамічна квітнеючай сталіцай ды парай буйных гарадоў і зонамі бяды ў рэгіёнах, дзе людзі ня маюць ні працы, ні заробкаў і адкуль хочуць вырвацца любой цаной.

Паводле некаторых ацэнак, без прапіскі ў Менску жывуць і працуюць да 200 тыс. чалавек.

Цана стандартнай аднапакаёўкі ў панэльным доме плошчай 33 кв. мэтры нават у самых далёкіх мікраёнах сталіцы даўно пераваліла за 20 тыс. даляраў.

Дынаміка зьмяненьня сярэдняй цаны прапановы 1 кв.м. агульнай плошчы 1—4-пакаёвых кватэраў у Менску за травень—чэрвень 2004 г.**



Колькасьць пакояў	Сярэдняя цана кв-ры, USD	Сяр. цана 1 кв.м. (*)
1	21461	635(-1)
2	29443	622(+3)
3	41259	613(+2)
4	47917	590(-1)

* — у параўн. з 5 ліпеня 2004 г.
** Паводле «Недвижимости Белоруссии».

Капіталісты з лычкамі

Мілыя падрабязнасьці зь непублічнага жыцьця беларускага войска

«Дзедаўшчына набыла вычварны эканамічны характар. Дзікі вайсковы капіталізм: у некаторых часьцях сяржанты звальняюцца, маючы ў кішэні неслабыя грошы. Дзедаўшчыну фізычную тут прыціснулі з дапамогай цялеснага агляду ў лазьні», — наш чытач Сямён Печанко за тры дні да дэмбелю дзеліцца сваім досьведам тэрміновай службы.

АНАТОЛЬ КЛЯЦЧУК

Раней я пісаў у «НН» усё больш з тым, каб праз прыватныя абвесткі павіншаваць родных і блізкіх са сьвятамі. Ня будзе выключэньнем і гэты раз, але ў гэтым лісьце віншаваньні выступяць у ролі дапаўненьня. Служыць засталося ўсяго некалькі дзён.

У адпачынку перабіраў леташнія «НН», складаў іх па нумарах і знайшоў вайсковыя лісты сп.Балахонава. Цікава было параўнаць свае адчуваньні і ўражаньні ад вайсковай службы з тым, пра што пісаў гомельскі карэспандэнт «НН». Дасьцёбкі засталіся нязьменнымі — тыя ж зашытыя кішэні, тая ж забарона слова «можна» (толькі «дазвольце»). Хіба што сама дзедаўшчына пачынае набываць вычварны эканамічны характар. Гэткі сабе дзікі вайсковы капіталізм: з «маладых» менш зьдзекуюцца маральна і фізычна, а больш націскаюць на матэрыяльны характар узаемаадносінаў. У некаторых часьцях сяржанты звальняюцца, маючы ў кішэні неслабыя грошы. Быць сяржантам і не набыць цягам службы мабілу — проста грэх! Тая ж мабілка на Фолюшы — таксама крыніца заробкаў: хвіліна размовы з мамай, каханай дзяўчынай — 1000—1500, а то й болей рублёў.

Парваліся боты ці знасілася вопратка — мусіш зьвярнуцца да камандзіра аддзяленьня (бо ён твой непасрэдны начальнік, асабліва калі ты яшчэ «дух»), а ўжо ён праз знаёмага, што служыць на складзе, знойдзе табе за «добрыя» грошы, не забыўшыся на сябе (часам камісійныя складаюць палову кошту), патрэбную рэч. І гэтак і ў Баранавічах, і ў Слоніме, і шмат дзе.

Рады за сябе і за тых, каму пашчасьціла служыць у Наваградку. Тут дзедаўшчыны амаль няма, а тое, што ёсьць, папросту сьмешнае ў параўнаньні зь вялікімі часьцямі. Тут увогуле досыць мяккі рэжым службы. Адзін прапаршчык ахарактарызаваў наш полк як ваенізаваны піянерлягер «Зорачка».

Але казаць пра тое, што дзедаўшчына цалкам зьнікла ці перайшла ў «эканоміку», не даводзіцца: нам з зайдроснай рэгулярнасьцю даводзяць пастановы вайсковага суду аб асуджэньні ваеннаслужачых. У пера-

- Адна сьцяна казармы аздоблена выявамі ВКЛаўскай вайсковай вопраткі, а супрацьлеглая — партрэтамі расейскіх палкаводцаў і іх выказваньнямі, кшталту “умри, но ни шагу назад!”.

важнай большасьці асуджаюць за нестатутныя ўзаемаадносіны, на другім месцы — злоўжываньне алькаголем.

Найбольш «славіцца» нестатутнымі адносінамі пяхота ў вялікіх брыгадах (Слонім), што тлумачыцца сапраўды нялёгкай службай, адсутнасьцю нармальных умоў, рэгулярных звальненьняў і г.д. У гэтым пляне наваградзкая часьць выглядае досыць прыстойна. А калі дадаць вельмі неблагую сталоўку, то можна казаць, што служыць тут проста. Хоць ёсьць хлопцы, што вельмі сумуюць па дзедаўшчыне і «мучацца» ў гэтай «аранжарэі».

Полк наш невялікі. Дзедаўшчыну тут прыціснулі некалькімі эфэктыўнымі мерамі. Кожную пятніцу ў лазьні праводзіцца цялесны агляд: любая падазроная драпіна ці сіняк бяруцца на ўлік, што можа пацягнуць за сабой разбор. Як і любое праяўленьне напружанасьці ці агрэсіі ў дачыненьні між салдатамі, заўважанае афіцэрам ці прапаршчыкам. У часе каранціну забароненыя любыя кантакты з «маладымі», а любое зьняважлівае дзеяньне ці нават слова (кшталту «дух») таксама караюцца. Тым ня менш, інцыдэнты здараюцца, толькі яны носяць прыхаваны характар.

Іншы аспэкт, які цікавіў мяне, — праявы Беларушчыны ў нашым войску. Пошук прымет таго, што беларусізацыя пачатку 90-х гадоў закранула і войска, ня быў марным. Адно што часта даводзіцца сутыкацца зь дзікім спалучэньнем расейскіх вайсковых традыцыяў і нашых уласных: адна сьцяна калідору аздоблена выявамі ВКЛаўскай вайсковай вопраткі, а супрацьлеглая — партрэтамі расейскіх палкаводцаў і іх выказваньнямі, кшталту «умри, но ни шагу назад!»; у кабінэтах вайсковых начальнікаў малюнкі Напалеона Орды (беларускія сядзібы) суседзяць з партрэтамі Суворава.

Часта сустракаюцца дзьвюхмоўныя шыльды і плякаты — на прадуктовым складзе шыльда зь беларускамоўным надпісам вялізнымі літарамі «Прадуктовы склад»: ашчадны прапар пашкадаваў фарбы ў 1995-м замалёўваць вялікі надпіс. А зроблены меншымі літарамі — «Міністэрства абароны РБ» — не паленаваўся абрусіць. Гэтак і плякаты ды стэнды з інфармацыяй пра герб, гімн, сьцяг. Усё, акрамя тэксту гімну і надпісу «Рэспубліка Беларусь» на «капусьце», — па-расейску. У сталоўцы на сьценах зробленыя надпісы па-беларуску, яны запрашаюць салдат «паспытаць капусты, курніку і кісялю».

Афіцыйная інфармацыя — на мове суседняй дзяржавы. Зімой, калі асноўны занятак салдатаў — несупыннае змаганьне са сьнегам, даводзілася чысьціць пляц рыдлёўкай з «Пагоняй». Гэтая фанэрка некалі ўпрыгожвала памяшканьне клюбу. У вучэбным корпусе спальнае памяшканьне і цяпер аздобленае выявай гербу Наваградку і ВКЛаўскай «Пагоняй». Падчас працы з тэхнікай назіраў на кабінах аўтамабіляў сьляды вайсковай нацыянальнай сымболікі — літары МА і бел-чырвона-белы сьцяжок. Цяпер жа засталіся толькі драпіны, а новай сымболікі, дзякуй Богу, рукі ня дайшлі намаляваць.

Што да людзей, то тут шмат што

- Войска дало мне знаёмства з цудоўнай дзяўчынай, а таксама сяброў. Што-што, а вайсковае сяброўства шмат мацнейшае за звычайнае.

залежыць ад узросту. Людзі больш сталага веку, асабліва рангам вышэй, выглядаюць абыякавымі да Беларушчыны, сярод іх шмат прыбышоў з краінаў былога Саюзу. Маладыя камандзіры больш прагматычныя, гнуткія і менш скаваныя ідэалягічна. Ад іх можна пачуць і знакі прыхільнасьці да нацыянальнай сымболікі як гістарычна абгрунтаванай. Яны ўжо адчулі выгоду службы на Радзіме, у сваім войску.

Увогуле, вайскоўцы ёсьць вайскоўцы — ім патрэбен загад. Загадаюць любіць Радзіму, мову, сымболіку — будуць любіць; загадаюць не любіць Амэрыку, NATO — загад ёсьць загад. А калі яшчэ нехта ўсур’ёз возьмецца вырашыць праблемы з матэрыяльнай базай, жыллём... Карацей, і тут эканоміка.

Чаму маладыя не жадаюць служыць? Асабіста ведаю людзей, якія б з радасьцю пайшлі ў войска, каб там гарантавана абувалі ў берцы, апраналі ў бушлат, а не ў шынэль, у нармальную форму. Многіх адпалохвае «пяшчанка» — форма савецкага ўзору. Дый тэрмін 18 месяцаў завялікі. Для параўнаньня: у Славеніі, па-першае, служыць не абавязкова, ёсьць альтэрнатыва, а тэрмін абавязковай службы — 3 месяцы, далей, калі ёсьць жаданьне, — кантракт. За 3 месяцы маладога жаўнера вучаць усяму. Заробак складае каля 700 даляраў, больш за тое — пасьля звальненьня гарантуецца льготнае паступленьне ў ВНУ, ільготы пры набыцьці жылля і працаўладкаваньні. Пра які прэстыж можа ісьці гаворка, калі наш заробак складае 11 400 рублёў у месяц (у шарагоўца), а зімой даводзіцца пацяшаць грамадзянаў аблавушкай, шынэлём, ня кажучы ўжо пра боты, якія хутка разношваюцца да неймаверных памераў, пра савецкую атрыбутыку.

На занятках па дзяржаўна-прававой падрыхтоўцы задаюць пытаньні пра апошнюю вайну: калі пачалася, калі скончылася, хто перамог, якія беларускія пісьменьнікі прысьвяцілі свае творы падзеям апошняй вайны? І чаго толькі ні пачуеш! Шмат хто ня ведае розьніцы між сусьветнай і вялікай айчыннай войнамі, а нехта назваў Быкава Іванам (!).

Працяг на старонцы 10.

Што слухаюць у войску?

Пераважная большасьць знаходзіцца пад уплывам расейскай і часткова заходняй папсы, хоць многія ведаюць песьні «N.R.M.» і часам пяюць іх пад гітару (а гітом апошняга часу былі «Госьці» з «Каралёў раёну»). Усё ж бракуе ў нашым войску спэцыфічных вайсковых песень, якія б ахвотна пелі салдаты. І пяюць яны «Пора домой» «Сектора газа». Вось дзе поле дзейнасьці для Вольскага і таварышаў! Трэба пісаць Крамбамбулю-military! БТ глядзець можна прымусіць толькі загадам, бо астатні час пануе маскоўскі «Муз-TV». Ня хочуць салдаты глядзець весткі з палеткаў, хоць ты іх расстраляй.

Пра лекараў і мову

Маю за сабою два месяцы ледзь не штодзённых абсьледаваньняў, кансультацый, рэнтгенаў і да т.п. Дыягназу дагэтуль пэўнага няма, але ёсьць пэўны сьветлы досьвед. Я меў дачыненьне з рознымі лекарамі — ад 25-гадовага маладзёна да сівога прафэсара, ад шараговага хірурга да загадчыка катэдры й дырэктара інстытуту. І я ведаю: шчырая беларушчына — зарука ўважлівага і асаблівага стаўленьня. Ня ўсе яны гавораць пабеларуску, асабліва маладыя, адны глядзяць зь цікавасьцю, іншыя — з зайздрасьцю, але ўсе — зычліва. Мой сын любіць кнігу пра Маўглі, дзе героі кажуць адзін аднаму: «Мы з табою аднае крыві, ты і я». Гэтаксама працуе беларушчына: ты наш, ты свой, ты родны.

Гавары да свайго лекара па-беларуску. Няма сумневу — дапаможа.

СР, Менск

Ліст разьвітаньня

Глыбока адчуваючы, наколькі сёньняшні рэжым акупаваў Беларусь, і бачачы адсутнасьць дэмакратыі і паглыбленую расейскую акупацыю, я, кроўны беларус, не магу больш жыць у такой краіне цудаў. Я вырашыў зрабіць той крок, які да мяне зрабілі тысячы людзей, — пакінуць краіну да лепшых часоў. Я думаю, што ў той краіне, куды я паеду прасіць прытулак, ацэняць мае здольнасьці. Я хачу разьвівацца ў адной са сфэр культуры, а тут мне прыходзіцца змагацца і супрацьстаяць афіцыйнай уладзе. Я думаю, што ў мяне атрымаецца мая задума, і я вярнуся, і Беларусь пабачыць дух свайго сына. Усе гэтыя гады я ўдзельнічаў ва ўсялякіх акцыях апазыцыі, хадзіў на рок-канцэрты. 13 разоў затрымліваўся міліцыяй, 6 разоў незаконна. Сваімі вачыма пабачыў наяўнасьці рэжыму і ўладавага абсурду. Для мяне прыкладамі беларуса зьяўляюцца памерлыя К.Каліноўскі, В.Быкаў і жывы кумір Л.Вольскі.

Яшчэ на аднаго чалавека будзе менш цяпер на вуліцах і плошчах, канцэртах, акцыях. Я маю маштабныя напалеонаўскія пляны і хачу дасягнуць вышынь маіх куміраў. А пакуль я зьяжджаю... каб вярнуцца.

АК, Менск

Фінберг расчараваў

4 ліпеня Глыбокае адзначыла 60-годзьдзе вызваленьня ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 590-годзьдзе гораду. Улады раёну зрабілі прыемны сюрпрыз для глыбачан, запрасіўшы ў Глыбокае Дзяржаўны канцэртны аркестар пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. На канцэрт сабралася шмат людзей.

З гэтай нагоды мне хацелася б адзначыць адну акалічнасьць. Аркестар за ўсё сваё выступленьне выканаў толькі дзьве (!) беларускія песьні. Гэта ня дзіўна, бо большую частку сваёй канцэртнай дзейнасьці гэты калектыў праводзіць у Расеі. Але ж гэта галоўны музычны калектыў краіны. Ды, відаць, музыканты, як і іншыя беларусы, мусяць езьдзіць у Маскву, каб зарабіць грошы на жыцьцё.

Зьміцер Лупач, Глыбокае

Конкурс для журналістаў-аналітыкаў

Рэдакцыя падвяла вынікі конкурсу для журналістаў-аналітыкаў. Пераможцаў абвешчана не было.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

Капіталісты з лычкамі

Працяг са старонкі 9.

Нампаліт пасьля такіх адказаў загадаў усім запісацца ў бібліятэку і ўзяць па адной кнізе Быкава. Людзі не арыентуюцца ў геаграфіі, некаторыя ня ведаюць табліцы множаньня. Тым ня менш, на палітінфармацыях, ці як іх тут завуць — прававым інфармаваньні, нам даводзяць, што мы самая адукаваная нацыя з адным з самых баяздольных войскаў у сьвеце.

Але ёсьць і прыемныя выняткі з правілаў. У войску я пазнаёміўся зь людзьмі, што ведаюць і чытаюць «НН», добрыя кнігі, арыентуюцца ў палітычнай сытуацыі. Такіх людзей нямала, хоць яны, зразумела зь якіх прычынаў, ня вельмі афішуюць свае погляды.

Старшыня маёй роты выявіўся ў сваіх поглядах заходнікам і прычыну шматлікіх бедаў бачыць у блізкім суседзтве з Расеяй. А аднойчы ўбачыўшы, што нехта чытае бульварны раманчык, параіў пачытаць Караткевіча з Быкавым. Іншы прапаршчык рэклямаваў кнігу Кастуся Тарасава «Адзін сьведка — Бог». Вось такія прапаршчыкі служаць у Наваградку.

Яшчэ адзін момант запомніўся. Неяк нас сабралі ў клюбе, сказаўшы, што з намі хоча пагутарыць сакратар адной патрыятычнай моладзевай арганізацыі. Я ведаў з газэтаў, што БРСМ мае намер стварыць свае пярвічкі ў войску, але ня думаў, што дэкляравана незалежны ад палітычных уплываў дзяржаўны інстытут — войска — так хутка здасца ў «палон». Гутарка хутка набыла характар рэклямы, і досыць цынічнай. Пра патрыятызм амаль ня ўзгадвалі. Асноўная частка часу была адведзеная пад пералік выгодаў (у выглядзе льгот і зьніжак) для чальцоў арганізацыі. Стварался ўражаньне, што нас папросту купляюць. Асаблівую агіду выклікала тое, зь якім задавальненьнем у голасе прамоўца абяцаў у хуткім часе далучыць у пералік ільгот прыватных стаматолягаў гораду. Нібы тыя зьнижкі робяцца зь яго ўласнай кішэні, а шчасьлівыя стаматолягі ня сьпяць начамі ў чаканьні радаснай падзеі — магчымасьці лячыць задарма самыя патрыятычныя ў горадзе зубы. Маладыя салдаты даволі абыякава паставіліся да прапановаў сакратара, але знайшліся і тыя, хто без прымусу (якога і не было, калі не лічыць заявы адказнай за ўсё гэта асобы наконт паблажак пры паступленьні на кантракт) пайшлі запісвацца. Першае расчараваньне прыйшло, калі давялося выкупляць пластыкавы білет і плаціць складкі.

Ці шкадую я, што трапіў служыць? Цяжка адказаць адназначна: такі наш абавязак і нічога не паробіш. Іншая рэч, што нідзе не падзенешся ад пачуцьця змарнаванага часу. Можна ж усяго навучыцца і за меншы час, не марынуючы людзей за плотам. Асабіста я не хацеў бы, каб сюды патрапіў мой брат, які яшчэ вучыцца, але і казаць: «Хлопцы, не ідзіце сюды, пазьбягайце як можаце!» — я не магу. Магу хіба параіць войска аматарам экстрыму: адрэналіну цягам 1—1,5 году ім хопіць зь лішкам. Хоць і жыць тут можна: у сучаснай арміі нікога ня зьдзівіш мабілкай, тэлевізарамі, відэатэхнікай і іншымі сучаснымі выгодамі. А дзедаўшчына і сапраўды ўжо ня тая. Галоўным сваім здабыткам лічу знаёмства з цудоўнай дзяўчынай, што ратавала мяне сваімі лістамі. А таксама сяброўства з хлопцамі, што маюць супольныя з маімі погляды і музычныя густы. Яны таксама не далі мне прапасьці, а я — ім. Штошто, а вайсковае сяброўства шмат мацнейшае за звычайнае, бо тут інакш і нельга: у войску адразу відаць, хто ёсьць хто.

Дзякую за ўвагу і выбачаюся за мажлівыя памылкі, а таксама за почырк. Пішу ноччу ў нарадзе, і трошкі бракуе сьвятла.

Сямён Печанко, Наваградак

Адна краіна — адна мова

Выпраўляючы памылкі, зробленыя пры Лукашэнку, трэба пачынаць зь першага рэфэрэндуму 1995 году.

Пасьля пашырэньня на ўсход Эўразьвяз налічвае 25 краін і, такім чынам, маючы насельніцтва 454 мільёны грамадзян, уяўляе сабой найвялікшае міждзяржаўнае ўтварэньне ў сьвеце. Гэтакая разнастайнасьць — самая прывабная рыса Зьвязу, хоць часам і нясе ў сабе перашкоды для эфэктыўнае жыцьцядзейнасьці ўтварэньня. У моўнай сфэры, як ні ў якай іншай, увасоблены прынцып павагі да правоў і годнасьці кожнае краіны.

Да пашырэньня на ўсход Эўразьвяз меў 11 моў у якасьці афіцыйных. З уступленьнем новых сяброў гэтая колькасьць павялічылася да 20. На сёньняшні момант большасьць краін Зьвязу прадстаўлена адной афіцыйнай мовай (паводле прынцыпу «Адна краіна — адна мова»), якая носіць назву тытульнае нацыі. Зразумела, што наяўнасьць такое значнае колькасьці афіцыйных моў значна ўскладняе функцыянаваньне органаў Зьвязу. У штодзённай працы Зьвязу задзейнічана па 80 перакладчыкаў на кожную афіцыйную мову, а перакладаньню падлягаюць каля двух мільёнаў старонак дакумэнтаў штогод. Ня дзіва, што ўступленьне ў дзеяньне дырэктыў Зьвязу часам адкладаецца на некалькі месяцаў, бо на пераклад патрэбен немалы час. Такім чынам, адна бюракратыя перамагае другую: моўная разнастайнасьць робіцца бар'ерам для неўтаймоўнага канцылярскага імпэту брусэльскіх чыноўнікаў.

Але прызнаньне такое колькасьці афіцыйных моў ёсьць усё ж найменшым ліхам. Уявім сабе, што Эўразьвяз дзеля спрашчэньня папяровае працы прыняў за афіцыйную толькі адну мову. Не выклікае сумненьняў, што гэта была б ангельская — мова, якой валодаюць, паводле некаторых падлікаў, каля 47% насельніцтва Зьвязу. Такое рашэньне было б найлепшым з пункту гледжаньня эфэктыўнасьці. Але ж ёсьць у Эўропе адна краіна, якая на такі варыянт ніколі не пагодзіцца. Ня трэба доўга думаць, каб адгадаць, што гаворка ідзе пра (mon Dieu!) Францыю. Французы да гэтага часу лічаць найвялікшай несправядлівасьцю, што ў сёньняшнім глябалізаваным сьвеце ня іхняя мова выконвае ролю міжнароднае, і афіцыйнага прызнаньня гэтага факту ніколі не прынялі б. Такім чынам, выпрацоўваецца варыянт дзьвюх афіцыйных моў — ангельскае і французкае. Але ж у гэтым выпадку незадаволеныя будуць гішпанцы, італьянцы, немцы і г.д. Вось жа, прызнаньне ўсіх дзяржаўных моў краін Эўразьвязу за афіцыйныя хоць і ёсьць праблематычным у сэнсе эфэктыўнасьці, але ж, зь іншага боку, дазваляе пазьбягаць канфліктаў паміж краінамі і падтрымлівае прынцып павагі да кожнага сябра Зьвязу. Такім чынам, спрацоўвае прынцып «Адна краіна — адна мова».

Выключэньнем з гэтага прынцыпу ёсьць пяць краін: Аўстрыя, Бэльгія, Кіпр, Ірляндыя і Люксэмбург. Тры першыя краіны з гэтага шэрагу карыстаюцца мовамі, якія так ці інакш уваходзяць у лік афіцыйных, гэта значыць нямецкай, французкай, нідэрляндзкай і грэцкай. Ірляндыя і Люксэмбург маюць па некалькі дзяржаўных моў, адна зь якіх ёсьць афіцыйнай альбо нацыянальнай (ірляндзкая і люксэмбурская), а мовы суседзяў выкарыстоўваюцца ў справаводзтве (ангельская ў Ірляндыі й нямецкая з французкай у Люксэмбургу).

Аднак жа выглядае, што хутка такіх выключэньняў з правіла «Адна краіна — адна мова» станецца менш. У апошнія месяцы ў ірляндзкім парлямэнце ўзмацніліся патрабаваньні пра наданьне ірляндзкай мове афіцыйнага статусу ў органах Эўразьвязу. Прыхільнікі ініцыятывы спасылаюцца на права кожнае краіны быць прадстаўленай у сьпісе афіцыйных моў Зьвязу, а таксама спадзяюцца на дадатковую падтрымку, якую атрымае ірляндзкая мова ад афіцыйнага статусу. Агулам пералік аргумэнтаў на карысьць афіцыйнага статусу ірляндзкае мовы налічвае пятнаццаць пунктаў. Ініцыятыва знаходзіць падтрымку практычна ва ўсіх палітычных функцыянэраў парлямэнту і, такім чынам, мае сур'ёзныя шанцы на посьпех. Урэшце, на ірляндзкай мове ўжо цяпер публікуюцца некаторыя дакумэнты Эўразьвязу, і згода афіцыйнага Брусэлю на прызнаньне ірляндзкай мовы будзе азначаць выпраўленьне недарэчнае несправядлівасьці.

Зразумела, усе пытаньні разьвіцьця ірляндзкае мовы ў самой Ірляндыі такім чынам ня вырашацца. Застаецца спрэчным, ці спрыяюць насамрэч меры дзяржаўнае падтрымкі захаваньню сацыяльных і моўных асяродкаў, якія спрадвеку карыстаюцца ірляндзкай мовай і ёсьць аўтэнтычнымі носьбітамі старажытнае культурнае традыцыі. Такія асяродкі, па-ірляндзку называныя «Gaeltacht», канцэнтруюцца на захадзе краіны і апошнія дзесяцігодзьдзі выяўляюць тэндэнцыю да скарачэньня сваёй колькасьці. Зь іншага боку, расьце цікавасьць да ірляндзкае мовы сярод дзьвюхмоўных і пераважна ангельскамоўных маладых ірляндцаў, якія ідэнтыфікуюць сваю прыналежнасьць да краіны і культуры з мовай. Вызначальным жа падаецца прынцыповая прыхільнасьць да ірляндзкае мовы сярод бальшыні эліты Ірляндыі.

Гэткі прынцыповы падыход да моўнага пытаньня вельмі прыдаўся б і ў Беларусі. На жаль, сярод беларускіх палітыкаў нават ад прыхільнікаў эўрапейскае інтэграцыі не заўсёды можна пачуць беларускую мову. Аднак жа ці можна вылучаць патрабаваньне пра ўступленьне ў Эўразьвяз без усьведамленьня пытаньняў, якія для кожнае краіны-кандыдаткі зьяўляюцца хатнімі заданьнямі? Адно з гэтых пытаньняў — якой мовай будзе карыстацца Беларусь у органах Эўразьвязу. Чакаць, што Эўразьвяз пры ўсёй яго дэмакратычнасьці зробіць для Беларусі выключэньне і пагодзіцца на афіцыйны статус дзьвюх моў, не выпадае.

Такім чынам, выбар за самімі беларусамі. Зрэшты, калі давядзецца выпраўляць памылкі, зробленыя падчас цяперашняга рэжыму, то пачынаць трэба будзе менавіта зь ягонага першага рэфэрэндуму 1995 г., які пазбавіў беларускую мову статусу адзінай дзяржаўнай і ўшчэнт дэзарыентаваў нацыю. Вяртаньне Беларусі на эўрапейскі, для яе цалкам натуральны кірунак разьвіцьця разам з устанаўленьнем дэмакратыі і рынкавае эканомікі прадугледжвае і дзяржаўнасьць беларушчыны. Паводле прынцыпу «Адна краіна — адна мова».

Сяржук Вінаградаў

Паехаць, каб застацца?

Каб зарабіць у Беларусі летам, трэба ціскацца ў аўтобусах, бегаць па горадзе ці хаця б быць членам БРСМ. А каб працаваць за мяжой, трэба абавязкова вярнуцца. «Клубнічка» і бульба летняе працы.

Хавайся ад бульбы

Цэнтар занятасьці насельніцтва можа ўладкаваць толькі на пастаянную працу, а сэзоннай падпрацоўкай не займаецца. Адзіны варыянт — запісацца ў студатрад, які прапануецца ня толькі цэнтрам, але і ВНУ. Праца даецца тым органам, які набірае атрад.

Самую наіўную прапанову на рынку летняй працы даў Маскоўскі райвыканкам Менску. У абвестцы прапанавалася ўсім — «ад піянераў да пэнсіянэраў» — заняцца перабораам бульбы. Плаціць у залежнасьці ад таго, колькі зробіш. Але ж мала.

Праца ў летніку — таксама варыянт занятасьці ў дзяржструктурах. Аднак аплата ня самая вялікая: студэнт-практыкант 3 курсу атрымае там блізу 95 тысяч. Выхавацелі — 140—150. Іншы варыянт — паехаць працаваць важатым і адпачываць у расейскі летнік. Такую паслугу нярэдка прапануе БРСМ па месцы вучобы. Хто быў, кажа, што лепей ня лезьці: і грошы малыя, і адказнасьць за дзяцей. У БРСМ можна запісацца ў інфармацыйныя, кампутарныя і будаўнічыя брыгады.

Можна падацца і ў кандуктары-кантралёры ў гарадзкі транспарт. За месяц ціскаціны ў славутым менскім «сотым» аўтобусе можна атрымаць 120—150 тысяч. Сюды дадаецца працэнт ад продажаў і прэміяльныя. Усяго атрымліваецца каля 220 тысяч. Столькі ж можна атрымаць і за працу прадавачак білетаў на вуліцах і ў кіёсках.

Чалавек-рэкляма

1 даляр і 20 цэнтаў за гадзіну — такая прыкладная стаўка вулічнага прамоўтэра. Анатоль рэклямуе на праспэкце Скарыны вядомыя расейскія сухарыкі. Кажа, што праца яго задавальняе: ён мусіць стаяць тры гадзіны на дзень цягам тыдня. Усяго за гэты час ён заробіць каля 25 даляраў. Наагул, максымальныя стаўкі ў агенцтвах — да 1,5 даляра. Пасады падзяляюцца для прамоўтэраў-«пачаткоўцаў» (раздача абвестак і ўлётак), «сярэдніх» (начапіць на сябе рэклямны шчыт ці касьцюм) і «асаў» (акцыі).

Пасьля таго як не былі падоўжаны ліцэнзіі прыватным падпісным агенцтвам, рэзка зьнізілася неабходнасьць у кур'ерах. Запрашаюць збольшага на пастаянную працу. Заробак, паводле абвестак, 240—360 тысяч за месяц. Часам за яго можна трапіць у сапраўдную кабалу: мусіш працаваць квартал штодня, апроч выходных. Аплата — у канцы квартала. Калі прапусьціў хоць дзень — звальненьне бяз выплаты заробленага. За распаўсюджваньне газэт, пры ўмове частковага працоўнага дня, плацяць 50—70 «зялёных».

Можна таксама расклейваць абвесткі. Але тут свая небясьпека. Лёгка можна натрапіць на міліцыянтаў. У такім выпадку — штраф 0,5 базавай велічыні (амаль 10 тысяч рублёў).

Што такое «cladocer»?

Пад фармулёўкай у абвестках «хатняя праца на поўную ці часткавую занятасьць» можа хавацца прапанова разводзіць грыбы (вешанку). Кошт — даляр за кіляграм. У кватэры прапануецца гадаваць шыншыл, шкурка якіх каштуе 40 даляраў, ці загадкавы «cladocer», за які даюць па 80—100 даляраў за 10 кіляграмаў. Для прыгатаваньня прадукту неабходна ёмістасьць на 30 літраў, дрожджы, лямпа, дрот ды тонкая тканіна.

Можна вырабляць вулічную плітку. Паводле інфармацыі прадстаўнікоў хатняга бізнэсу, па іх тэхналёгіі выходзіць каля 1 даляра прыбытку за мэтар квадратны. Дый дзе знайсьці пакупніка на тую плітку, каб не прыйшлося дарма брукаваць вуліцы? Прапануюць таксама расклейку абвестак, рассылку і запаўненьне блянкаў. У пробным лісьце ці пры сустрэчы — што малаімавер на — вам парадзяць уключыць у працэс усю сям'ю, паабяцаюць заключыць дамову. Аднак толькі пасьля набыцьця абсталяваньня ці каталёгаў.

Яшчэ адзін варыянт — праца кансультантам па продажы касмэтыкі. Інакш кажучы, у сеткавым маркетынгу. Каб стаць кансультантам, мусіце падрыхтаваць 35—65 даляраў, каб выкупіць стартавы набор. Калі зможаце прадаць увесь набор, атрымаеце 150 даляраў. Адсюль — максымальны прыбытак складзе амаль 115 «зялёных». Праўда, гэта зусім няшмат, бо звычайна адзін набор разыходзіцца за 3—6 месяцаў. Галоўная ж задача сеткавага маркетынгу бачыцца ў тым, каб прыцягваць новых дыстрыбутараў. Дарэчы, нярэдка ў такіх кампаніях могуць дасылаць абвесткі ад эвангелісцкіх цэркваў.

Арытмэтыка замежжа

Найлепшым варыянтам працоўнага лета доўгі час лічылася паездка за мяжу па праграмах накшталт «Work & Travel». Кошт іх каля 1200 даляраў. Сюды дадаецца консульскі збор 100 баксаў, страхоўка — 45 і каля 250000 рублёў на членскі ўнёсак. Пасьля неабходна прайсьці сумоўі ў агенцтве, што забясьпечвае праграму, і пасольстве ЗША. Іншая праграма — «Au Pair». Гэта хатняя праца ў нямецкіх сем'ях. Апроч усяго, навучаць нямецкай мове за кошт гаспадароў і будуць плаціць стыпэндыю каля 200 эўра на месяц.

Аднак усе карты студэнтаў і арганізатараў паездак зблытала леташняя пастанова Міністэрства адукацыі №79. У ёй быў вызначаны тэрмін 3 месяцы, на які студэнт можа выехаць за мяжу. Калі спазьніўся зь вяртаньнем — пра гэта паведамяць у Міністэрства і «орган міграцыі па месцы жыхарства». Пры паўторным спазьненьні могуць адабраць ліцэнзію ў арганізатара. Некаторыя і не зьбіраюцца вяртацца: застацца будаўніком у Нью-Ёрку выгадней, чым ехаць назад ва ўнівэр. Пару год працы — і заробіш на астатняе жыцьцё ў Беларусі. Праўда, ізноў візу на Захад адкрыюць наўрад ці.

Клубнічка

Першым вопытам працы за мяжой для многіх становіцца збор клубніц ці іншай садавіны-гародніны. Саша, выпускнік БДУ, зьбіраў клубніцы на адной фэрме ў Вялікай Брытаніі. «Працаваць пачыналі а 6—7-й раніцы, — кажа ён, — і не пазьней за 17—18 гадзін былі вольныя. Справа гэта нялёгкая, бо ўвесь час прыходзіцца стаяць ракам. Найлепшаму зборшчыку тыдня гаспадар дарыў бутэльку марачнага віна». Аплата роўная 4—5 фунтам за гадзіну, але ў асноўным зьдзельная.

Асноўнай праблемай для многіх становіцца жыльлё. «На клубніцах» звычайна даюць баракі, у найлепшым выпадку — катэджы на вялікую колькасьць жыхароў. Кошт жыльля — каля 23 фунтаў стэрлінгаў — вылічваецца штотыднёва з заробку. Паездкі па прадукты арганізоўваюцца раз на тыдзень. Выходны — субота. На некаторых фэрмах арганізавана сьвяткуюць дні нараджэньня: па фунце з носа і «бумбокс» нованароджанаму. Дарэчы, пасьля такіх паездак «на клубніцы» рэдка хто паўтарае падарожжа. Для рызыкантаў: у Інтэрнэце ёсьць беларускі «клубнічны» сайт з адрасамі больш чым 50 фэрмаў. Пры гэтым пачалі адчыняцца першыя беларускія ягадныя плянтацыі.

Нашы за мяжой

Для беларусаў і ўсіх былых савецкіх працы, вядома, заўжды хапае. Часьцей за ўсё — афіцыянты, пакаёўкі, нянькі. Аплата звычайна пагадзінная — ад 6—8 даляраў. Аднак афіцыянт можа зарабляць да 30 баксаў/эўра на «чаявых». Калі пастараццa, у Чэхіі можна ўладкавацца гідам для турыстаў адсюль.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Праца за мяжой не гарантуе трываласьці. Даша падчас сваёй працы ў ЗША перамяніла 14 месцаў. Яна кажа, што самае паганае ў праграмах кшталту «Work & Travel» — трапіць не ў сэзон. «Тады мусіш катацца аўтастопам па краіне ад гораду да гораду і шукаць сабе месца».

Здараліся з нашымі і незвычайныя гісторыі а-ля Папялушка. У Лёндане хлопец-беларус зарабляе тым, што здае жыльлё студэнтам з РБ і былога СССР. А некаторыя дарастаюць да пасады рэстараннага мэнэджэра. Праўда, у іх гэта нешта накшталт нашае кашталянкі: замкнуць дзьверы і выключыць сьвятло. Дарэчы, заробку наяўнасьць пасады не дадае.

Сяргей Трафілаў

Прэйскурант

Студэнт-практыкант 3 курсу атрымае ў летніку блізу 95 тысяч. Выхавацелі — 140—150.

Кандуктарам-кантралёрам у менскім «сотым» аўтобусе можна зарабіць за месяц 220 тысяч.

Сярэдняя стаўка вулічнага прамоўтэра — 1,2 даляра за гадзіну. Пасады падзяляюцца для прамоўтэраў-«пачаткоўцаў» (раздача абвестак і ўлётак), «сярэдніх» (начапіць на сябе рэклямны шчыт ці касьцюм) і «асаў» (акцыі).

Заробак кур'ера — 240—360 тысяч за месяц. Мусіш працаваць квартал штодня, апроч выходных. Прапусьціў хоць дзень — звальненьне бяз выплаты заробленага. За распаўсюджваньне газэт, пры ўмове часткавага працоўнага дня, плацяць 50—70 «зялёных».

Кіляграм вырашчанай вешанкі каштуе даляр.

Каб стаць кансультантам у сеткавым маркетынгу, трэба за 35—65 даляраў выкупіць стартавы набор. Прадаць яго можна за 150 даляраў. Звычайна адзін набор разыходзіцца за 3—6 месяцаў.

«На клубнічцы» працуюць ад 6—7-й раніцы да 17—18-й. Аплата — 4—5 фунтаў за гадзіну. Кошт жыльля — каля 23 фунтаў стэрлінгаў — вылічваецца штотыднёва з заробку.

Заробак афіцыянта, пакаёўкі, нянькі за мяжой — ад 6—8 даляраў за гадзіну. Аднак афіцыянт можа зарабляць да 30 баксаў/эўра на «чаявых».

Парадоксы рынку нерухомасьці

Працяг са старонкі 8.

Краіна пакінутых вёсак

Між тым, пакуль рынак сталічнай нерухомасьці паказваў стаханаўскія тэмпы росту, цэны на аб'екты нерухомасьці, якія знаходзяцца за 30—40 і болей км ад абласных цэнтраў, засталіся на ранейшым узроўні. Цікава тое, што ніхто і не спрабаваў ацаніць гэтыя аб'екты. Фактычна ў сфэру інтарэсаў рыэлтараў цяпер трапляюць, акрамя буйных гарадоў і іх прыгарадаў, толькі курортныя мясьціны — Лагойск, Нарач, Мядзел, Браслаўшчына.

У некаторых вёсках насельніцтва можа проста не ўяўляць, колькі каштуе ўласнае жытло, ня ведаючы нават прыблізных лічбаў. Як казаў мне з тонкім гумарам рыэлтэр з прэстыжнага менскага агенцтва зь відам на праспэкт Скарыны: «У Ратамцы кожная бабуля мае сваякоў у горадзе, таму яны цудоўна інфармаваныя аб тым, колькі насамрэч каштуе яе жытло. Вунь, дом пад знос прадалі нядаўна за 15000, дзялянка там 30 сотак. Зусім іншая песьня — куды-небудзь пад Маладэчна паехаць. Дзядок з бадуніччa памірае, на чарніла грошай няма, а на дзялянцы стаяць пяцісьценак і хлеў. Дык я й кажу: што страшнага будзе, калі зруб мне прадасі, будзеш жыць у хляве, ён у цябе цёплы, затое грошы будуць, а пэнсія ня хутка. Той адразу выдае: «Ну, дваццатка рублёў амэрыканскіх зь цябе, і забірай зруб гэты пад халеру». Тут якраз старшыня сельсавету ідзе: «Ты што, Станіслававіч, з глузду зьехаў, так танна прадаваць? Пяцьдзясят!» Аддаў я дзеду гэтаму пяцьдзясят даляраў, узьняў зруб кранам на плятформу і павёз».

Зь зямлёю пакуль ня так лёгка ажыцьцяўляць аналягічныя махінацыі. Але сам факт таго, што людзі пачалі з пахмялюгі прапіваць уласнае жытло, стварае трывожны прэцэдэнт: пры пэўных умовах можна купляць зямлю за бясцэнак і будаваць на ёй што хочаш. Поле для дзейнасьці шырокае: у тым самым Маладачанскім раёне рыэлтары лічаць нармальнымі вёскі з 5—10 кінутымі дамамі. Што тады можна казаць пра які-небудзь ушчэнт прапіты Дрычын, дзе ледзь не палова насельніцтва большую частку свайго жыцьця «адпачывае» ў месцах пазбаўленьня волі?

Выходзіць, што чым даражэйшай робіцца нерухомасьць у сталіцы і буйных гарадах Меншчыны, тым ніжэй падае кошт зямлі ў правінцыі. Гэтая сытуацыя адлюстроўвае ня толькі крызыс беларускага рынку нерухомасьці, але й крызыс сацыяльнай структуры насельніцтва. Сярод афіцыйных асобаў Беларусі даўно ўжо модна параўноўваць нашу краіну з суседнімі Расеяй і Украінаю: маўляў, напрыклад, у Расеі файна жывуць толькі Масква і Санкт-Пецярбург, астатняя ж частка пацыху вымірае ў галечы, у нас жа — сацыяльны эгалітарызм: у Менску афіцыйны сярэдні заробак толькі на 20—30 даляраў перавышае сярэдні па краіне. Але гэта толькі афіцыйны. Пры тым становішчы, якое апісана вышэй, ніякім эгалітарызмам і ня пахне. Інакш бы кожны жыў на сваім месцы, як гэта бывае ў краінах нават з адносным дабрабытам.

Раман Мамчыц

Пра нас пішуць

Беларуская тэма прыцягвае ўвагу швэдзкіх публіцыстаў. Колькі гадоў таму сьвет убачылі два выданьні ёмістае кнігі журналіста Чэля-Альбіна Абрахамсана «Беларусь: 89 мілімэтраў ад Эўропы», а вось цяпер Беларусь зацікавіла й іншага рэпартэра.

Пасьля гістарычных уводзін аўтар адразу пераходзіць да найноўшай гісторыі. Разьдзел кнігі «Даярчын сын» напісаны швэдзкім рэпартэрам на падставе ўражаньняў, атрыманых ад наведваньня родных мясьцін Аляксандра Лукашэнкі, сустрэч зь яго сваякамі, школьнай настаўніцай ды колішнімі аднавяскоўцамі. Вобраз атрымаўся размаіты й уражальны: яго можна сьцісла перадаць у словах «заняпад» і «дэградацыя». Асаблівую цікавасьць уяўляюць зьмешчаныя тут жа назіраньні швэдзкага журналіста за працай беларускіх спэцслужбаў: напрыклад, Юнгваль распавядае пра тое, якія нумары праслухоўваюцца КДБ у менскім турысцкім гатэлі.

Наступны разьдзел — «Палітыкі-імітатары» — прысьвечаны апазыцыі. Аўтар жорстка крытыкуе апазыцыйныя сілы за іх дзеяньні ў 1999 і 2000 г., пачынаючы з альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў і заканчваючы байкотам выбараў у «палату». Крытыка шмат у чым справядлівая, але ёй бракуе разуменьня таго, што апазыцыянэрам у тыя гады даводзілася вырашаць ня столькі пытаньні ўласнага палітычнага рэнамэ, колькі праблему захаваньня беларускае незалежнасьці.

Скончаецца кніга інтэрвію з лукашэнкаўскім функцыянэрам Мікалаем Чаргінцом, які, між іншага, выказвае шчырую перакананасьць, што і ў Швэцыі існуе «дзяржаўная ідэалёгія».

Бясспрэчна, што і кніга Абрахамсана, і «рэпартаж» Юнгваля заслугоўваюць сама меней аднаго — быць выдадзенымі ў Беларусі і па-беларуску. Бо паглядзець на сябе вачыма іншых яшчэ нікому й ніколі ня шкодзіла.

Лявон Баршчэўскі

Тобіяс Юнгваль. Кантроль: Рэпартаж зь Беларусі (Tobias Ljungvall. Kontroll. Rapport från Vitryssland). — Стакгольм: Сільк-фёрлаг, 2003.

Мэтадычны дапаможнік беларускага настаўніка / Цэнтар Супольнасьць. — Менск, 2003.

Ліцэйская мэтадычка

«Мэтадычны дапаможнік беларускага настаўніка» менш за ўсё падобны да звыклай мэтадычкі. Гэтая тоўстая кніга (больш за 200 старонак) сабрала пад адной вокладкай знаных у пэдагогіцы й мэтодыцы асобаў: Лявон Баршчэўскі, Пятро Садоўскі, Міхаіл Гусакоўскі, Мікалай Запрудзкі, Аляксандар Палоньнікаў, Уладзімер Колас… Выданьне — своеасаблівы падрахунак досьведу Беларускага ліцэю: установа, што нават пасьля фармальнага закрыцьця застаецца навучальнай установай эўрапейскага ўзроўню, падаецца ў кнізе ўзорам гуманітарнага ліцэю.

Як расказала «НН» адна з аўтарак кнігі Тамара Мацкевіч, у кнігу ўвайшлі ня толькі ўласна беларускія распрацоўкі, але і замежныя знаходкі, адаптаваныя да нашых умоў. Гэта, дарэчы, яскрава вылучае выданьне на тле іншых мэтадычных дапаможнікаў, мэханічна перакладзеных з ангельскае.

Кніга будзе мэтава распаўсюджвацца па настаўніцкіх клюбах, бібліятэках, а таксама рассылацца пэдагогам-наватарам, якія займаюцца мэтадычнай адукацыяй калег.

Адам Воршыч

АНДРЭЙ ПЯНКЕВІЧ

15 год «Улісу»

У гонар такой даты каманда Славы Кораня дае вялікі канцэрт, таксама перавыдаюцца легендарныя альбомы.

За 15 год гурт выдаў дзьве кружэлкі і дзясятак альбомаў, пайграў у найлепшых канцэртных залях Эўропы, зьмяніў некалькіх вакалістаў, падавалася, што распаўся, але выжыў дзякуючы намаганьням бясьсьменнага гітарыста каманды Славы Кораня, які вырашыў засьпяваць сам пасьля сыходу чарговага вакаліста. Цікава, што ў Кораня сёлета і асобны юбілей — 30 год у рок-н-роле. Гэтыя дзьве падзеі стануцца нагодай для вялікага сольнага канцэрту, што мяркуецца правесьці ў кастрычніку. Мажліва, што ў ім возьмуць удзел былыя ўдзельнікі каманды. Праўда, перамоваў з экс-улісаўцамі яшчэ не вялося. Што да ранейшых вакалістаў «Улісу», то Корань ня мае зь імі ніякага кантакту: «Ні з Патрэем, ні з Тумашовым мы даўно ня бачыліся, усе кантакты зь імі згубіліся». Андрэй Патрэй, голас якога гучыць у песьнях зь легендарных альбомаў «Чужаніца», «Краіна доўгай белай хмары», жыве пад Воршай. Некалькі год таму яго адшукаў у мястэчку Барань бард Зьміцер Бартосік. Былая рок-зорка сталася заўзятым праваслаўным вернікам. Што да вяртаньня на сцэну, то Патрэй адказаў, што такое магчыма, «есьлі Госпаду будет угодна і жыў буду». Дзе цяпер Алег Тумашоў (сьпяваў у альбоме «Танцы на даху») — невядома. «Апошні раз ён мне тэлефанаваў з год таму», — кажа Корань.

Тым часам БМА-груп занялася падрыхтоўкай CD-бокс-сэту зь легендарнымі альбомамі гурту (першыя альбомы існуюць у касэтным і «элпэшным» варыянтах). У выданьне ўвойдуць поўныя вэрсіі «Чужаніцы», «…белай хмары» і «Танцаў на даху» з рарытэтнымі трэкамі «Мы прыйдзем сюды», «Лунай, пан Руст», «Цягнік на Нясьвіж», таксама вядзецца пошук песьні «Будапэшт, Прага, Кабул». БМА-груп зьвяртаецца да прыхільнікаў групы, у якіх маглі захавацца канцэртныя запісы, відэа- і аўдыёматэрыялы «Ўлісу».

Сяргей Будкін

ЦЫТАТА

Беларускі Таранціна

Utro.ru аб выхадзе ў расейскі пракат «Акупацыі»:

«Акупацыя» — сучаснае, эўрапейскае кіно. Ёсьць тут і інтрыгоўны сюжэт, і дух вэстэрну, і постмадэрнісцкая ігравая структура (рэжысэра Андрэя Кудзіненку ўжо ахрысьцілі «беларускім Таранціна»!), і дзівоснай прыгажосьці ды сілы паэтыка сапраўднага народнага эпасу».

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Актуальныя праблемы тэорыі літаратуры й фальклёру: Працы членаў катэдры тэорыі літаратуры БДУ / Уклад. Т.Марозава; Пад нав. рэд. В.Рагойшы. — Менск: Бэст-прынт, 2004. — 224 с. 200 ас.

Зборнік навуковых артыкулаў да 10-годзьдзя катэдры тэорыі літаратуры БДУ.

Аўрамчык М. Знаёмыя постаці: Нарысы / Маст. Т.Царова. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 254 с. 2000 ас.

Героі нарысаў — Якуб Колас, Янка Купала, Зьмітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Максім Танк, Іван Мележ, Пётар Машэраў і інш.

Вяршынін Мікола. Выбраныя творы (Сатыра і гумар). — Менск, 2003. 600 ас.

Кніжку можна справядліва назваць энцыкляпэдыяй легальнага гумару апошніх гадоў БССР.

Гумянюк Ю. Вуліца тыгровых архідэяў: Вершы 1987—2002 гг. — Беласток, 2003. — (Б-ка час. «Правінцыя»).

У кнігу ўвайшлі творы з зборнікаў «Водар цела», «Твар Тутанхамона», «Рытуал», «Пізанская вежа», «Вуліца тыгровых архідэяў».

Кавалёў С. Стомлены д'ябал: П'есы. — Менск: І.Логвінаў, 2004. — 190 с. 300 ас.

«Гермэнэўтычная драматургія, або Актуалізацыя забытых сэнсаў» — так ахарактарызаваў уласную творчасьць у прадмове да кнігі С.Кавалёў. Зборнік уключае п'есы, што ідуць на беларускай, расейскай і польскай сцэнах: «Стомлены д'ябал», «Легенда пра Машэку», «Звар'яцелы д'ябал», «Тарас на Парнасе». У «Акадэмкнізе» 6900 руб.

Котаў М. Народныя гульні. — Менск, 2004. — 36 с. 299 ас.

«Хто ўмее весяліца, той гора не баіцца», — сьцьвярджае прыказка, вынесеная ў эпіграф да гэтае сьцілла выдадзенае, але зьмястоўнае брашуры. Ужо самі назвы зьмешчаных тут гульняў захапляюць дасьціпнасьцю ды міжволі падымаюць настрой: «Каша прыгарэла», «Спрытняга», «Смачная бульба», «Эва, адыдзі ад дрэва»… Укладальнік тлумачыць правілы старадаўніх народных гульняў «для любога ўзросту, танцавальных, жартоўных, масавых ды ціхіх, для абрадавага сьвята, любой вечарыны, вясельля, юбілею, на сьвежым паветры й у памяшканьнях». Пытайцеся на ўправе БНФ.

Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі / Нав. рэд. А.Краўцэвіч. — СПб.: Неўскі прасьцяг, 2003. — 243 с. : іл. 3000 ас.

Аўтар дасьледаваньня — «беларус, грамадзянін Польшчы, прафэсар Беластоцкага ўнівэрсытэту, цалкам свабодны ад савецкіх ідэалягічных штампаў, прапагандысцкай тэрміналёгіі ды ўвогуле ад стылю мысьленьня савецкага чалавека». У цэнтры ўвагі — самыя «балючыя» пытаньні гісторыі Беларусі канца XIX—XX стст.: фармаваньне беларускай нацыянальнай ідэі, змаганьне за сваю дзяржаўнасьць, барацьба супраць «нацыянал-дэма-кратаў» і калектывізацыя ў БССР, партызанскі рух і акупацыйная палітыка ў гады вайны, дзейнасьць Беларускай Цэнтральнай Рады, карэктаваньне межаў Беларусі і пасьляваенныя рэпрэсіі, эпоха Машэрава, русіфікацыя, Чарнобыль, дэмакратычная апазыцыя й інш. Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў.

Фальклярыстычныя дасьледаваньні: Кантэкст. Тыпалёгія. Сувязі: Зб. артыкулаў / Пад навук. рэд. Р.Кавалёвай, В.Прыемка. — Менск: Бэстпрынт, 2004. — 283 с. 280 ас.

Зборнік складаецца з разьдзелаў «Фальклёр у кантэксьце культуры», «Фальклёр — міталёгія», «Традыцыйныя жанры фальклёру», «Фальклёр — літаратура — мова». Увагу прыцягваюць новыя аспэкты вывучэньня народнай творчасьці: «Фальклёр і гендэр», «Фальклёр і постфальклёрныя зьявы». «Акадэмкніга» прапануе выданьне за 7800 руб.

Алексиевич С. Последние свидетели (сто недетских колыбельных). — Москва: Пальмира, 2004. — 238 с. 5000 ас.

Новая дакумэнтальная кніга даказвае: нягледзячы на сотні старонак, прысьвечаных другой сусьветнай, мы дасюль вельмі мала ведаем пра «чалавечае шаленства ў форме вайны». Маленькія героі гэтага выданьня, сёньня ўжо вельмі сталага веку людзі, праз усё жыцьцё пранесьлі жахлівыя ўспаміны. «У адрозьненьне ад дарослых, — піша аўтарка ў прадмове, — дзеці запомнілі самыя яскравыя й трагічныя моманты, а ня ўвесь малюнак падзеі або пачуцьцяў». Пра «сваю вайну» — жорсткую й бязьлітасную — распавядаюць «не палітыкі, не салдаты й не філёзафы», а беларускія дзеці. Яны — «самыя неперадузятыя сьведкі. Ім нельга ня верыць». У кнігарні «Веды» цана 12240 руб.

Пракаповіч І. Насельніцтва Пастаўскага краю. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 56 с.: іл.

Насельніцтва Пастаўшчыны з часу засяленьня людзьмі й да пачатку XXI ст. — колькасьць жыхароў і яе зьмены, нараджальнасьць і сьмяротнасьць, натуральны прырост, сямейны стан, шлюбы й разводы, міграцыі, мовы родныя й чужыя — гэткія й іншыя аспэкты праблемы разглядае краязнаўца ў сваёй кнізе.

Тацяна Вабішчэвіч

«Турысты» бясплатна

На сайце «Тузін гітоў» (music.from-by.net) зьявілася для спампоўваньня песьня «Турысты» з новага альбому «Крамбамбулі».

Апрача таго, «Тузін гітоў» абвясьціў акцыю «Шалёны парад». З 12 ліпеня можна прагаласаваць за ўсе 60 песень, якія цягам 8 месяцаў існаваньня парталу змагаліся за званьне гітоў. Штодня са сьпісу будуць зьнікаць 2 кампазыцыі з найменшай колькасьцю балаў. Па выніках «Шалёнага параду» ў жніўні ў адным зь менскіх клюбаў пройдзе фінальны канцэрт пераможцаў.

Сайты Славаміра й «Партызану»

Белнэт папоўніўся некалькімі новымі сайтамі. На асабістай старонцы Славаміра Адамовіча (www.bielarusy.org/adamovich) можна пачытаць ягоныя вершы й «Лісты з Поўначы». Займеў свой сайт і часопіс «pARTisan» (www.partisanmag.org). Сайт «Фальклёр беларускі» (falklor.at.tut.by), арганізаваны МГА «Хаўрус сяброў», пакуль што мае толькі разьдзел, прысьвечаны народнаму касьцюму.

«A&K» – the best

Дуэт «Аляксандра і Канстанцін» выпусьціў новы дыск «Мой Галілей — Найлепшае». У яго ўвайшлі дзевяць песень з папярэдніх альбомаў, а таксама 5 новых кампазыцый, у тым ліку «My Galileo», зь якой дуэт выступаў на Эўрабачаньні.

Хмарачосы пагражаюць храму

Камітэт сусьветнай спадчыны ЮНЭСКА ўключыў Кёльнскі сабор у сьпіс аб'ектаў сусьветнай спадчыны, якія апынуліся пад пагрозай. Пагроза ўзьнікла не для самога будынку, а для навакольнага гарадзкога ляндшафту, які й вызначаецца непаўторным сылюэтам сабору. У горадзе ідзе вышыннае будаўніцтва, і сабор губляецца між новых будынкаў. Будаўніцтва храму распачалося ў 1248 г., а закончылася ў 1880 г.

Кітайцы супраць Галівуду

У Кітаі пад урадавую забарону трапілі фільмы «Гары Потэр і вязень Азкабану», «Чалавек-павук-2» і «Шрэк-2». На думку кітайцаў, гэтыя фільмы вучаць дзяцей хлусіць, грубіць, ня слухацца старэйшых і кепска сябе паводзіць. Аднак забароненыя для пракату фільмы ўжо можна купіць на пірацкіх DVD-дысках.

Памёр Лефэўр

У Маракешы (Марока) у 84 гады ад сардэчнага прыступу памёр славуты францускі комік Жан Лефэўр. Ён здымаўся ў стужках «І Бог стварыў жанчыну», «Анжаліка й кароль», «Жандар з Сэн-Трапэзу», «Жандар жэніцца».

«Крыштальны глёбус» для Палянскага

На 39-м Міжнародным кінафэстывалі ў Карлавых Варах рэжысэр Раман Палянскі атрымаў «Крыштальны глёбус» за надзвычайны ўнёсак у сусьветны кінэматограф. Прысутныя на фэстывалі, у тым ліку й прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс, віталі ўзнагароду Палянскага стоячы. Цяпер на студыі «Барандаў» ён пачне здымаць фільм «Олівэр Твіст» паводле аднайменнага раману Дыкенса.

«Рухнама» forever

У беларускіх перакладчыкаў можа зьявіцца чарговая замова: Сапармурат Ніязаў напісаў другі том «Рухнамы». Першы том быў перакладзены паўтара году таму.

АВ

Выстава Крукоўскага

Выстава мастака Ўладзімера Крукоўскага — на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13). На выставе можна паглядзець творы за пэрыяд 1975—2000 г. Наведаць можна з панядзелка па пятніцу (13.30—19.00). Уваход вольны.

Вандроўка па сядзібах Меншчыны

18 ліпеня ЗБМ «Эўрапейскі шлях» запрашае ўсіх ахвотных у вандроўку «Сядзібы Меншчыны», прысьвечаную сёлета юбілею выдатнага айчыннага кампазытара Станіслава Манюшкі. Наведаем Плісу, Шыпяны, Родкаўшчыну, Ляды, Пятровіцкае вдсх., Сьмілавічы, Убель, Дукору, Дудуткі, Кухцічы, Узду, Станькава і Прылукі. Т.: 8-029-402-56-78.

Марк Шагал і сцэна



У Нацыянальным мастацкім музэі **да восені** працуе выстава «Марк Шагал і сцэна». Экспазыцыя складаецца з 37 малюнкаў: акварэль, гуаш, алей. Сярод іх — эскізы росьпісаў касьцюмаў для Габрэйскага камэрнага тэатру (1920), эскізы да балетаў «Жар-птушка» (1945) і «Дафніс і Хлоя» (1958).

Доўгія вёрсты вайны

Да пачатку восені ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры працуе выстава «Доўгія вёрсты вайны...»: кнігі, рукапісы, фатаздымкі, лісты пісьменнікаў-франтавікоў, людзей, чыё дзяцінства супала з ваеннымі гадамі. Тамсама можна паглядзець і выставу «Народжаная для мора» — мадэлі суднаў розных часоў, творы жывапісу, старадаўнія карты...

Маляваны дзёньнік

Да 16 ліпеня працуе выстава «Васіль Быкаў: маляваны дзёньнік пісьменьніка» ў галерэі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту (пр.Ф.Скарыны, 24).

Баразна

А ў «М-Галерэі» Інстытуту імя Гётэ (Фрунзэ, 5) **16 ліпеня** апошні дзень працуе выстава Міхала Баразны «Заля чаканьня».

Тэатры

Расейскі тэатар

15 (чц) — «Анджэла ды іншыя».
16 (пт) — «Перад захадам сонца».
20 (аўт) — «Дэтэктар хлусьні».
21 (ср) — «Амфітрыён».
22 (чц) — «Суцяшальнік удоў».
23 (пт) — «На Залатым возеры».

«Беларускія сэзоны»

19 (пн) — «Ці лёгка падмануць жанчыну?».

Клюбнае жыцьцё

Гудвін

15 (чц), 21.00 — Live Jazz.
16 (пт), 21.00 — Live Jazz.
17 (сб), 21.00 — Live Jazz.

Графіці

22 (чц), 20.00 — канцэрт Віктара Дурыцына і Людмілы Кіліўнік (Масква) з праграмай «Жарты ўбок. Лірыка і гумар». Т.: 8-029-758-40-54.

Белая вежа

15 (чц), 22.00 — «White Tower»: dj Grizzly.
16 (пт), 22.00 — Euro Disco.
17 (сб), 22.00 — Euro Disco.

Bronx

15 (чц), 22.00 — dj Necto Lucas (Масква).
16 (пт), 22.00 — Live Jazz.
17 (сб), 22.00 — dj Top, dj Grizzly.
21 (ср), 22.00 — «Alegrias».
22 (чц), 22.00 — dj Michel Quazar (Масква).
23 (пт), 22.00 — «Al Narrator Orchestra».

Ямайка

16 (пт), 21.00 — Pre/After-party.
17 (сб), 3.00 — Afterparty.

X-Ray

16 (пт), 22.00 — dj Top.
17 (сб), 22.00 — dj Noche.

Кінаафіша

«Аўрора» (253-33-60)
«Вечнае зьзяньне жарсьці»***: **16** (пт) 17.10, 19.10, 21.10; **17, 18** (сб, ндз) 15.10 (іл), 17.10, 19.10, 21.10.
«Забіць Біла»****: **16, 18** (пт, ндз) 16.30; **17** (сб) 16.30, 18.40, 21.50.
«Таямнічая рака»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 18.40, 21.00.
«Пацалунак жыцьця»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 18.40, 20.40.

«Берасьце» (272-87-91)
«Коньнік па імені Сьмерць»: **16** (пт) 18.50; **17, 18** (сб, ндз) 14.00 (іл), 18.50.
«Маладыя таткі»***: **16—18** (пт—ндз) 16.30, 21.00.

«Дружба» (240-90-13)
«Брудныя танцы-2»***: **16** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **17, 18** (сб, ндз) 18.00, 20.00.

«Кастрычнік» (232-93-25)
«Пасьлязаўтра»: **16** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **17, 18** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

«Масква» (223-27-10)
«Пасьлязаўтра»: **16** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **17, 18** (сб, ндз) 14.00 (іл) 16.20, 18.40, 21.00.

«Мір» (288-22-33)
«За два крокі ад гільятыны» (дак. фільм), «Яшчэ пра вайну» (маст. фільм): **16—18** (пт—ндз) 18.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **16—18** (пт—ндз) 12.30 (іл), 15.00.
«Вельмі страшнае кіно-3»***: **16** (пт) 20.00; **17, 18** (сб, ндз) 16.00, 20.00.
«Пацалунак жыцьця»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 18.40, 21.00.
«Амэрыканская раскоша»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 18.40, 21.00.
«Таямнічая рака»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 18.40, 21.00.

«Перамога» (223-77-66)
«Забойная парачка: Старскі і Хатч»: **16** (пт) 14.30; **18** (ндз) 16.00 (іл), 18.40, 21.00.
«Амэрыканская раскоша»*** («Кінафармат 4х4»): **16** (пт) 16.40, 18.40, 21.00.
«Таямнічая рака»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 16.00 (іл), 18.40, 21.10.
«Як яна дыхае» (Тыдзень францускага кіно): **17** (сб) 12.00 (безь перакладу).

«Піянер» (227-64-87)
«Блубэры»***: **16—18** (пт—ндз) 18.45, 21.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **16—18** (пт—ндз) 16.00.

«Цэнтральны» (220-34-16)
«Ван Хельсынг»***: **16** (пт) 11.00, 15.30, 18.00, 20.30; **17, 18** (сб, ндз) 11.00, 15.30.
«Пацалунак жыцьця»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (сб) 18.00, 20.30.
«Амэрыканская раскоша»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 18.00, 20.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Для дзетак

Музэй гісторыі беларускай літаратуры

Да 1 верасьня працуе выстава «Жывапіснае падарожжа ў сьвет казак» — аўтарскія ілюстрацыі да кніг Анатоля Волкава.

«Аўрора»

«Шрэк»: **17, 18** (сб, ндз) 12.30.
«Як Майк»: **17, 18** (сб, ндз) 14.30.
«Берасьце»
«Тарзан»: **16** (пт) 10.30; **17, 18** (сб, ндз) 12.00.

«Дружба»

«Зоркавыя сёстры»: **16** (пт) 10.30; **18** (ндз) 15.00.
«Карпарацыя монстраў»: **16** (пт) 13.00; **17** (сб) 15.00.

«Мір»

«Сьцюарт Літл-2»: **16** (пт) 10.30, 14.00; **17, 18** (сб, ндз) 14.00.

«Перамога»

«Цімур і яго камандас»: **17, 18** (сб, ндз) 14.00.

«Піянер»

«Навагодні паштальён»: **16** (пт) 10.20; **17, 18** (сб, ндз) 12.20.
«Атлянтыда: згубленая імпэрыя»: **16** (пт) 12.20; **17, 18** (сб, ндз) 10.20.

КІНАФАРМАТ «4Х4»

Таямнічая рака (Mystic River)
ЗША, 2003, каляровы, 137 хв.
Жанр: Драма
Адзнака: 6 (з 10)

Не шукайце трупаў у містычнай рацэ

Сяброўства трох дзяцей незваротна распадаецца, калі аднаго з хлопчыкаў звозяць на машыне вычварэнцы. Праз 25 год надломлены Дэйв (Цім Робінс) ня можа забыць пакутаў, Шон (Кевін Бэйкан) — паліцэйскі, які спрабуе змагацца са злом, а колішні гарэза хлапечай кампаніі Джымі (Шон Пэн) — былы крымінальнік.

Лёс ізноў зводзіць сяброў дзяцінства. Калі 19-гадовую дачку Джымі жорстка забіваюць, Дэйв вяртаецца дадому акрываўлены — а Шон распачынае сьледзтва па справе забойства.

Для 73-гадовага Клінта Іствуда, які выступіў рэжысэрам карціны і напісаў да фільму даволі неблагую музыку, важным зьяўляецца ня сам дэтэктыўны сюжэт, а глыбінныя стасункі паміж людзьмі, атмасфэра чалавечых характараў, схаваныя ў штодзённасьці жарсьці.

Акторскія працы ў фільме бліскучыя, з тонкімі нюансамі адценьняў. Сцэна ля ракі паміж Цімам Робінсанам і Шонам Пэнам ператвараецца ў патаемную — і звычайную — машыну наканаваньня, дзе ахвяры й каты — жывыя людзі па сваім выбары й па сваім характары.

Раман Дэніс Лехейн пераўтварыў у сцэнар Браян Гелгеланд, вядомы няўдалымі сюжэтамі фільмаў жахаў. Жанр дэтэктыўнага трымценьніка разьмякчаецца, у плыні карціны зьяўляюцца нясьпешныя затокі і тоні — і фільму бракуе аўтарскай упэўненасьці, вызначанай аўры, каб стаць шэдэўрам. Здаецца, абавязковыя для псыхалягічнага кіно дзіцячыя ўспаміны ўсё болей ператвараюцца ў стылёвы архаізм, хаця гэты архаізм і здольны шчэ быць нейкай падпоркай.

Амэрыканскія крытыкі надзвычай высока ацанілі карціну, роўна як і амэрыканскія гледачы. Але містычная рака дзейнічае не на кожнага.

Андрэй Расінскі

КАЛЯНДАР

Сваё ўзяло верх

100 гадоў з пачатку творчасьці Янкі Купалы

Сёлетні год Міністэрства культуры, Міжнародны фонд Янкі Купалы і Літаратурны музэй народнага песьняра абвясьцілі сотай гадавінай пачатку беларускамоўнай творчасьці Янкі Купалы.

Што ж сталася падставаю?

Янка Купала свае першыя творы напісаў па-польску. Першы беларускамоўны Купалаў твор быў надрукаваны толькі ў 1905 г. То адкуль узялася дата «1904 год» як пачатак Купалавай беларускамоўнай творчасьці? Як адбыўся гэты пераход — з польскай мовы на мову тутэйшага люду? Хто паспрыяў?

Сам Янка Купала пра гэта распавядаў: неяк раз трапілі ў рукі кнігі Дуніна-Марцінкевіча і Мацея Бурачка, і ўся польская пісаніна сышла на нішто. Паспрыяла і зьмена ў 1904 г. месца жыхарства. У 1904 г., якраз сто гадоў таму, Луцэвічы бяруць у арэнду недалёкі ад Менску, усяго за 14 кілямэтраў, фальварак Бараўцы пані Стралковай. Паблізу Бараўцоў, у Казімераўцы, жылі знаныя ў Менску асьветнікі Самойлы. Знаёмства з Уладакам Самойлам, зь Ядвігіным Ш., размовы зь імі, рэвалюцыйныя тагачасныя адозвы і скіравалі Купалу ў беларускае рэчышча.

Якія ж мы маем пра Янку Купалу дакумэнты, зьвесткі з 1904 г.?

Найперш ягоны фатаздымак, які так і пазначаны: «Янка Купала, 1904 г.». Зь яго на нас глядзіць яшчэ нічым не спакушаны, нікому яшчэ ня знаны, яшчэ ўвесь у самім сабе юнак. Апрануты ён інтэлігентна — у старанна адпрасаваны з саматканага сукна пільчак. З-пад гэтага пільчака выглядае каўнерык-стойка белай кашулькі, павязанай кваціцтай хусьцінкай матыльком-гальштукам. У вачох журбота, задуменнасьць і шматшмат пытаньняў пра сваё наступства, будучыню свайго краю — неакрэсьленую, незразумелую, якую ён ужо пачаў шукаць, счыркаў пра яе не адзін аркуш паперы. Адзін зь іх, акурат з 1904 г., і дайшоў да нас. Гэта аўтограф вершу «Мая доля». Ён і дае нам падставу лічыць 1904 год годам пачатку беларускамоўнай творчасьці Янкі Купалы. Пад аўтографам дата — 15 ліпеня 1904 году. Згадаем гэты верш:

Мая доля

Мая доля, дык вось доля,
Каб ты лопнула была!
Каб у чыстае дзе поле
Ад мяне ты уцякла!
Чаму ж, доля, ты цяжкая,
Тут мне шчасьця не даеш?
Чаму ж, горкая такая,
Сьмерць мне лепей не пашлеш?

Гэтак цягам мяне мучыш,
Як душу у пекле чорт;
Гэтак сэрца маё сушыш,
Што аж сам я ссох, як хорт!

Не даеш ты мне спакою
Ані ўночы, ані ўдзень, —
Усё ходзіш ты за мною,
Як нябожчыка той цень.

Куды толькі ні парвуся,
Каб хоць троха лепей жыць,
Дык калі не аглянуся,
Мая доля тут бяжыць.
...

І жыцьцё ня міла стане,
Згінуць хочацца зусім.
І як бы хто сэрца зране, —
Нейкі боль чуваць у ім.
...

1904

Першы Купалаў беларускамоўны верш, як бачым, вельмі ж сугучны з Багушэвічавым «Горам».

Польскамоўная творчасьць Янкі Купалы — гэта была адначасова і проба Купалавага беларускага пяра. Ён разумеў, што піша свае вершы не на той мове, якую ён чуе штодня, што зь ягонай душы б'ецца-бруіць іншая моўная крынічка, больш плынная, плыткая, нязмушана ўрываецца ў польскую моўную ручаінку, змушае яго думаць па-беларуску, а шукаць, падбіраць словы і формы польскія, багаж якіх у яго, пэўна ж, ня быў такі багаты, як беларускі. Таму ён пасьля грунтоўна шчырых гутарак з такімі сваімі самавітымі настаўнікамі, як Ядвігін Ш., Уладак з Казімераўкі, іхніх радаў лёгка і нязмушана перайшоў у беларускамоўную плынь, дзе слова ягонае зіхацела шматлікімі колерамі вясёлкі, пахла водарам нашых палеткаў і красак.

Беларускія вершы складаліся яму досыць лёгка і пранікнёна. Але не было дзе іх друкаваць. У 1904 г. яшчэ не было беларускамоўнага друку. Тады Купалавы беларускамоўныя вершы хадзілі пераважна ў

Янка Купала ў 1904 годзе.

рукапісах. Некаторыя зь іх Купала паказваў Уладзімеру Самойлу. Той чытаў іх і заахвочваў Купалу да пісьма, абяцаючы дзе-небудзь абнародаваць іх. І слова сваё ён стрымаў. Неўзабаве ён надрукаваў яго верш. Праўда, у расейскамоўнай газэце — верш «Мужык». Час яго публікацыі пазначаны траўнем 1905 г. Але, думаецца, вынашаны ён Купалам быў усё ў тым жа 1904 г., які мы лічым пачаткам Купалавай беларускамоўнай творчасьці.

Уладзімер Содаль

Навек люблю і помню

Зьмест альбому складаюць запісы розных часоў, зробленыя адным з найлепшых тэнараў Беларусі, які заўчасна пайшоў з жыцьця. Аляксандар Рудкоўскі, выпускнік Маскоўскай кансэрваторыі, ляўрэат Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага 1970 г., 14 гадоў аддаў беларускай опэры, пазьней працаваў у Дзяржаўным аркестры народных інструмэнтаў, у Ансамблі песьні і танцу Ўзброеных Сіл Беларусі.

У альбом уключаныя арыі з клясычных опэр, у тым ліку арыя Мечыслава з опэры «Кастусь Каліноўскі» Дз.Лукаса, клясыка бэльканта і расейскага рамансу, народныя беларускія і расейскія песьні, а таксама «Зорка Вэнэра», «Радзіма мая дарагая» і, апроч таго, адна песьня Ігара Лучанка пра тое, як адзін чалавек просіць падарыць яму шчасьце (дакладную назву песьні не прыводжу ў сувязі з тым, што, згодна з рашэньнем суду Ленінскага раёну Менску, назва песьні, прыведзеная ў друку без узгадненьня з аўтарам, зьяўляецца парушэньнем аўтарскага права).

На вялікі жаль, падобнага роду выданьні зьяўляюцца пераважна толькі тады, калі самі выканаўцы пабачыць іх ужо ня могуць.

Апасьлівы Слухач

Аляксандар Рудкоўскі. «Ковчег», (р) 2003.

Расейскія горкі

Беларусь, твой слухач дачакаўся ўжо! У дыскарнях зьявілася складаначка зь дзіўнюткай назваю «Русские горки». Скажаш, што такога дабра ў нас заўсёды хапала? І памылішся. Уся анамалія гэнага зборніку ёмістасьцю 21 трэк палягае ў тым, што выканаўцы тут спрэс тутэйшыя. Але ні на вокладцы, ні на кружэлцы пра гэта нідзе ня сказана. *Догадайся, мол, сама!* Гэны мамэнт лішні раз пацьвярджае, у якіх палёх пасьвяцца пэўныя нашыя шоў-бізнэсоўцы. Здавалася б, чаго прасьцей — ну напішы ты на дыску «Белорусские горки» (на вокладку — партрэт Еўдакіма Раманава з капітальнай завушніцай!). Дык не, не дазваляе нешта. І нават элемэнт дызайну, што нагадвае стылізаваны бела-чырвона-белы сьцяг, — хутчэй выпадковасьць.

Гэтая кампіляцыя ўяўляе сабою ў прынцыпе неблагую падборку лёгкай музыкі, зробленай у Беларусі. Бальшыня выканаўцаў сталі збольшага вядомымі за апошнія год-два, парваўшы тутэйшыя папсовыя гіт-парады. З агульнай канвы выпінаюцца Аня Багданава (манера выкананьня «Проста словаў» творыць уражаньне, што пяюха вось-вось выскачыць з джынсікаў), «J_MORC» (гульня сугуччаў і сэнсаў у «Альбіёне»), Сярога (шансон навыварат у «Ляльцы»), BIA «Харлі» (зь беларускамоўнымі «Танцамі на палянцы»), «Лепрыконсы» (зь нечаканымі постмадэрнісцкімі іголачкамі ў песьні «Мора»: «Мы лета правадзілі ў сёлах, а хто пакручэ — ў лагерах») ды дуэт Іны Афанасьевай з гуртом «Цягні-Штурхай». Пра «Ляпіса Трубяцкога» тут казаць не выпадае: гурт ня здраджвае сабе.

Астатнія зорачкі грашаць пераймальніцтвам. Грыбалёва капіюе Варум. Раманава і Драздова — Эву Польну. «Чук&Гек» — «Отпетых мошенников». Тэндэнцыя. Паслухаўшы колькі разоў плытку, я прыплыў да высновы: няблага было б для пачатку ўвесь гэты калектыў прымусіць зрабіць трыб'ют «Народнага альбому».

Сяргей Балахонаў

Выпуск 1. Складанка супэргітоў ад «Расейскага радыё». AistMUSIC, 2004.

Супольны праект, Byvaitse zdarovy — Felix, 2004

Bella ciao

«Экспартны» праект «WZ-orkiestra», да якога далучыліся Алесь Камоцкі (у якасьці аўтара і перакладчыка з італьянскай на беларускую), Аляксандар Памідораў, Віктар Шалкевіч, Лявон Вольскі, «Стары Ольса». Сваімі песьнямі музыкі дзякуюць італьянскаму народу за ягоную бескарысьлівую дапамогу беларускім дзецям, што пацярпелі ад Чарнобылю. Адпаведна, італьянская гульлівасьць («Пі, гуляй, ня плач, ня сьпі», — сьпявае Вольскі ў «Фэлічыце») тут суседзіць са смутным беларускім блюзам Шалкевіча і наадварот — карчомная весялосьць «Старога Ольсы» перагукаецца з тужлівай лірычнасьцю «Маёй Раманы». Большасьць песень беларускаму слухачу ўжо добра вядомая. Рарытэты — загалоўная песьня, дзе ўпершыню сьпявае бізнэсовец Зьміцер Папоў, «Сьпяваць можа кожны» ад Сяргея Верамейчыка. Таксама ёсьць унікальная магчымасьць паслухаць «шансоннага» Памідорава («La Balera»). Ён ужо сьпяваў і па-расейску, і па-нямецку, і на ідыш, тут жа — па-італьянску. Цэльнага ўражаньня дыск не пакідае.

Сяргей Будкін

РАРЫТЭТ

Сьцяг брыгады

Група «Siver». (р) 2004, дэма

Завочна пляскаю ў ладкі з нагоды здаровага нахабства ўдзельнікаў калектыву. Паставіць перад сабой задачу пакласьці на музыку тэкст «праграмнай» паэмы Аркадзя Куляшова азначае, што амбіцыі «сіверных» людзей сягаюць самых высокіх планак кшталту рэкордаў Бубкі ў скачках з тычком.

Але амбіцыі амбіцыямі, ды часы на вуліцы іншыя. Мода на буйныя музычныя формы ў папулярнай музыцы адышла ў мінулае, радыйныя фарматы дыктуюць свае калецкія стандарты. Такім чынам, група «Siver» быццам патрапіла са зробленым ёю не ў свае часы, значна спазьніўшыся нарадзіцца. Хоць калі б яна прапанавала нешта прынцыпова новае...

Але, на жаль, гэтага няма. Праўда, запісаная кампазыцыя ў цэлым няблага, што нечакана як для пачаткоўцаў. Ды вось музычны бок пакідае жадаць значна большай разнастайнасьці. Складаецца ўражаньне, што гучыць адна й тая ж мэлёдыя, якую музыкі спрабуюць разнастаіць за кошт рытмічных малюнкаў ды гукавых эфэктаў. Аднак мэлядычнага матэрыялу не хапае, музычныя вобразы асобных песень надта ж расплывістыя, і таму выслухаць усё да канца ня проста.

Так што адным нахабствам, хай сабе і самым здаровым, адной брыгадзе ўзьняць над паэтычнаю крэпасьцю сьцяг складана. Нагадаю, што яшчэ ў самым пачатку 80-х за «Сьцяг брыгады» браліся Мулявін зь «Песьнярамі», аднак з наскоку не адолелі, адышлі на загадзя падрыхтаваныя пазыцыі. Паўторнага штурму ня здарылася. Мо і ў гэтым выпадку ня варта было грудзямі ды проста на амбразуры?

Сьцягнуты Слухач

Неруш–песьні

Справа «Палацу» жыве і перамагае! Са спазьненьнем у 10 гадоў гурт «Неруш», які ў свой час здабыў вялікую калекцыю ўзнагарод на розных міжнародных фольклавых фэстах, рашыўся на сьмелы экспэрымэнт: спалучыць пярліны народнай музыкі з сучаснымі аранжаваньнямі і гучаньнем электронных інструмэнтаў. У якасьці аранжавальніка выступіў цяперашні музычны кіраўнік БДА «Песняры» Вячаслаў Шарапаў.

Вядома, перад ягонымі вачыма й вушамі напэўна стаяў «Палац», але ў сваіх опусах спадар Шарапаў рэвалюцыйны зрабіць не імкнуўся. Усё выканана гладка і бяз выкліку, я б нават сказаў — без асаблівай выдумкі. Пэўне, з тае прычыны, што «Неруш» не рызыкаваў кардынальна парушыць уласны вобраз, які складаўся гадамі. Такім чынам, мы маем пэўны экспэрымэнт, які напэўна ня будзе мець працягу.

Беларускія народныя песьні. «Ковчег», (р) 2004.

Хоць у цэлым слухаць гэтыя запісы ў параўнаньні з ранейшымі таго ж «Нерушу» больш цікава, аднак сярод уключаных у альбом песень можна пачуць і тыя, якія зрабіліся папулярнымі крыху раней у выкананьні іншых прадстаўнікоў беларускага фолк-мадэрну. Але, хіба, у тусоўку «Палацу», «Крыві» і «Юр'і» «Неруш» усё адно не імкнецца: занадта тут усё «правільна», згодна з апрабаванымі часам традыцыямі.

Слухач Нерушымы

Неруш–танцы

Беларускія народныя песьні і танцы. «Ковчег», (р) 2004.

У гэтым альбоме «Неруш» паўстае ў звыклым абліччы, выконваючы песьні і танцы ў іх традыцыйным, адаптаваным да гарадзкой сцэны выглядзе. Упікнуць выканаўцаў у чым-небудзь такім няправільным немагчыма — наадварот, усё запісана правільна. Можна нават няблага пабавіць час на якой прыватцы, што адбываецца на ўлоньні прыроды, паскакаць ды падсьпяваць музыкам. Гучыць «Неруш» нармалёва, кляса навідавоку, хоць, шчыра кажучы, пэўны сум выклікае тое, што залішне ўжо моцна трымаецца калектыў стандартнага выканаўства, нібыта застыўшы ў часе. Гэткі, ведаеце, музэйчык, хоць і годна дызайнаваны.

Вось толькі не разумею: у папярэднім альбоме адна песьня называецца «Ты ж мяне падманула», а ў гэтым тая ж песьня мае назоў «Ты сказала». Гэта, трэба сказаць, вялікая, глябальная задача для дасьледчыкаў фальклёру — вызначыцца, пра што, уласна кажучы, гаворка ідзе.

Парушаны Слухач

Тихо музыка в дом мой вошла

Рамансы Марыны Марозавай на вершы Тацяны Мушынскай. Сьпявае Натальля Руднева. «Ковчег», (р) 2003.

Сапраўды — рамансы. Мяркуючы па аўтарстве і выкананьні — суцэльна жаночыя. Зьмест альбому складаюць тры цыклы: «Исповедь женщины», «О, тишина! О, немота!», «Музыка в дом мой вошла…». На вокладцы — ілюстрацыя карціны Альфонса Мухі. Вось чаму чакалася, што й зьмест, і сама музыка будуць пазначаны нечым такім мадэрновым, выйсьцем па-за межы ўвогуле даволі кансэрватыўнага жанру.

Не, безумоўна здольная кампазытарка Марына Марозава цьвёрда, як юнак на дапросе, трымаецца рамансавых традыцый. Можа, дзеля гэтага творы гэтыя не выклікаюць у мяне асабіста (з папраўкай, вядома ж, на тое, што я — невялікі аматар рамансавага «ціхага ўваходу» ў дом, дзе мне ня надта цікава) амаль аніякіх усплёскаў душэўнага хваляваньня. Не, не таму, што я безуважна пускаю ў свой дом каго заўгодна. Тут іншае. Не чапляе, ведаеце, не трывожыць, не хвалюе.

Аднак кажу толькі пра сябе. Можа, якога заўзятара традыцый рамансу тое якраз і моцна пракаўбасіць. Ведаю, што спн.Мушынская піша па-беларуску. Сучасныя рамансы ў Беларусі, якія пішуцца і выконваюцца па-расейску, — гэта, безумоўна, глыбокая традыцыя, якой проста неабходна пакланіцца ў пояс. А мо нават і ніжэй...

Рамантычны Слухач

«Фінскі парлямэнт вітаў Быкава стоячы»

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Працяг са старонкі 2.

— Спадар Юка, чаму менавіта фінскі валун?

— Атрымаць валун з Вуасааараў на магілу было апошнім жаданьнем Быкава. Пра гэта мне паведаміў Някляеў. Я ведаў Быкава, вёў ягоныя справы два гады ў Фінляндыі — з боку фінскага ПЭН-Цэнтру стараўся рабіць як мага болей для спадара Васіля… Мне было вельмі добра з Быкавым, шкада было тады разьвітацца. І калі я даведаўся пра жаданьне з валуном, дык зьвярнуўся ў мэрыю гораду Хельсынкі. Яны ў той жа момант згадзіліся падараваць камень беларускаму боку. У нашым аддзеле культуры ёсьць выдатны чалавек — Ур'ё Лармала. Ён нават трохі ведае пра Беларусь (Юка вачыма ставіць тут смайлік. — **Аўт.**). Мы ўтрох — Ур'ё, Някляеў і я — паехалі, выбралі камень. Горад Хельсынкі замовіў яго… На адным баку там напісана «Васіль Быкаў. 1924—2003», а ззаду, па-беларуску і па-фінску, выбіта «Ад гораду Хельсынкі». І ўсё.

— Дарогаю з валуном былі праблемы?

— Да Вільні везьлі машынаю пасольства Фінляндыі ў Літве. Далей беларусы самі везьлі…

— Як выбіралі валун?

— Ну як?.. Самы прыгожы… Гэта, вядома, умоўна. Выбіралі тыповага прадстаўніка валуновага насельніцтва Фінляндыі.

— Сам Быкаў мог бачыць гэты валун?

— Думаю, так. Кватэра Быкава была за сотню мэтраў ад мора. Там ёсьць такая дзікая паўвыспа — яна была любімым месцам Васіля Быкава. Быкаў кожны вечар хадзіў туды, Ірына Міхайлаўна можа лепш пра гэта расказаць. Валун — з тых мясьцінаў. Так што міма праходзіў дакладна. Дарэчы, вам цікава, чаму валун з Вуасааараў?..

— У кнізе «Лісты ў Хельсынкі» Быкаў маляваў гэтыя камяні…

— Так! Гэта адна з маіх любімых кніг! Я ня толькі глядзеў малюнкі, але і з дапамогай Уладзімера Някляева чытаў вершы Рыгора Барадуліна. Барадулін — вельмі глыбінны паэт!..

— У малюнках Быкаў дакладны?

— Мне пашчасьціла прысутнічаць у большасьці сытуацый з быкаўскіх малюнкаў. Усё абсалютна дакладна. У мяне ёсьць нават карткі з тымі ж момантамі, што Быкаў паказаў на паперы. Памятаеце малюнак «Пад дубамі Мукула»? У Мукуле быў пісьменніцкі кангрэс, у якім удзельнічалі і мы з Быкавым. Якраз было сьвята Мітумары — фінскі Іван Купала. А вогнішча было ў садзе адвакатара фінскага ПЭН-Цэнтру. На тым малюнку маскоўскі пісьменьнік Яўген Папоў, а зьлева — я… Таксама малюнак «Журналісты ўсюды дастануць». Гэтых італьянскіх журналістаў я прыводзіў да Быкава, перакладаў іхнюю гутарку… Вядомы малюнак «Першы прытулак». Мала хто ведае, што на бальконьчыку справа над кавярняй «Marinero» Быкаў намаляваў сябе…

— Раскажыце, калі ласка, пра Вуасааары.

— Вуасаары — мікрараён Хельсынкі на беразе мора. Там Фінскі заліў — суворая паўночная вада. Там валуны, скалы, шэрыя горы. З расьліннасьці — карлікавыя хвойкі, адаптаваныя да любых штормаў. Мне думаецца, што Вуасааары, гэты марскі бераг, стаў пэйзажам душы самога Быкава. Ён быў чалавекам стрыманым, строгім, але ўнутры гэта быў вулькан мужнасьці і эмоцый, храбрасьці і гумару. Гэта быў пэйзаж бязь лішняга дэкору. Быкаў знайшоў там сябе, лепш зразумеў свой і беларускі характар увогуле. Я думаю, што Васіль Быкаў быў шчаслівы ў Фінляндыі. Ён сказаў мне, што ніколі ў жыцьці не працаваў гэтак многа, плённа і спакойна. Быкаў добра адаптаваўся ў нас. Фіны і беларусы ўвогуле падобныя. Мы такія ж бульбаеды, аматары самагону (Юка вымаўляе павольна, зь любоўю: «са-ма-гон». — **Аўт.**). Беларусы ў душы, як фіны ў рэале, — хутаранцы... Мэнталітэт і жыцьцёвыя рытмы ў нас досыць падобныя. Тое, што сёньня маюць фіны, маглі б мець і беларусы. Бо мэнтальнасьць для гэтага падыходзіць, замінае іншае…

— Дзе Быкаў бываў у Фінляндыі?

— Некалькі разоў мы са спадаром Васілём былі ў маёй роднай вёсцы. Ходзіць Быкаў па фінскай вёсцы — і відаць, што адчувае сябе як дома. Такі стары-бляндын: у вёсцы ніхто ня верыў, што гэта ня фін! Нашы старыя нездарма ўважалі Быкава за свайго. Падабенства было ня толькі вонкавае. Быкаў быў стрыманым, але мудрым, унутрана багатым чалавекам. Ягоныя рытмы былі чыста фінскія. У нас Быкаў адпачыў душой…

— Спадар Малінэн, раскажыце, чаму Фінскі ПЭН-Цэнтар увогуле прымае беларускіх пісьменьнікаў?

— У нас на гэта існуе адпаведная праграма. Калі пісьменьніку недзе дрэнна, замінаюць працаваць, ціснуць — ён можа прыехаць у Фінляндыю і бясплатна жыць. Гэтым правам сёньня карыстаюцца пад 30 аўтараў, пераважна з былога Саюзу. Госьцю даецца стыпэндыя — на жыцьцё хапае. Праўда, адсоткаў шэсьцьдзесят тых грошай ідзе на аплату жытла ды камунальных паслугаў. Важны момант: гэтая стыпэндыя не абкладаецца падаткамі.

— Быкаў займаўся ў Фінляндыі грамадзкай дзейнасьцю?

— Ён выступаў перад людзьмі, даволі шмат. Прамаўляў і ў фінскім парлямэнце — там вялікага пісьменьніка віталі стоячы. Быкаў выступаў сьмела, але аналітычна, без дэмагогіі. Васіль Быкаў казаў пра тое, што нельга ў цывілізаваным грамадзтве дапускаць дыктатуру. Казаў, што рэжым у адной-адзінай краіне небясьпечны для ўсёй Эўропы…

У Фінскага ПЭНу цёплыя адносіны зь беларусамі, мы добра ведаем Беларускі ПЭН-Цэнтар (у Юкі выходзіць «пень». — **Аўт.**). Упершыню я завітаў у Беларусь у верасьні 1996 г. Якраз быў канстытуцыйны крызыс, і мы сабраліся на ПЭНаўскі форум. У тую пару распусьцілі апошні законны беларускі парлямэнт… Зь беларусамі нам добра, беларусы добра адаптуюцца. У нас надзіва шмат паралеляў — у гісторыі, мэнталітэце… Наша першая задача — уратаваць пісьменьніка. Беларусаў нам ратаваць цікава — бо яны цікавыя людзі. Да ўсяго ж, Фінляндыя — гэта Эўразьвяз. І я не ўяўляю, каб у нас прыгняталі чалавека за ягоныя погляды. Можна сказаць, што мы «імпартуем» беларускіх літаратараў, каб паглядзець на такое дзіва. Бо Фінляндыя — краіна забясьпечаная. І, ведаеце, бывае трошкі нуднавата…

— Някляеў жыў у той кватэры, што і Быкаў?

— У Васіля тады скончыўся двухгадовы тэрмін. Ніколі не стаяла пытаньне, каб Быкаў застаўся ў нас канчаткова. Але цяпер я шкадую, што мы тады адпусьцілі яго — у мяне ёсьць нейкае пачуцьцё вінаватасьці. Бо Быкаву было вельмі добра ў Хельсынкі. Наколькі я ведаю, лепей, чым у наступных месцах жыхарства... Зь Някляевым мы пазнаёміліся ў 1999 г. на кангрэсе ў Варшаве. У Валодзі тады якраз узьніклі… тонкасьці… Тады мы і вырашылі, што наступным беларусам у нас будзе Някляеў. Дарэчы, сам Васіль рэкамэндаваў нам Уладзімера.

— І хто будзе наступным беларусам?

— Покуль ня ведаю. Але дакладна нехта будзе — да той пары, пакуль будзе рэжым. Я ўпэўнены, што сваёй прысутнасьцю беларусы ўзбагачаюць творчае жыцьцё і літаратурны сьвет Хельсынкі.

— Мне думаецца, што быцьцё нашых пісьменьнікаў у Фінляндыі можна параўнаць з аздараўленьнем «чарнобыльскіх» дзяцей за мяжою…

— Добрае параўнаньне.

— Якая выгада Фінскаму ПЭН-Цэнтру вазіць да сябе беларусаў?

— Простая выгада. Асабіста я раней ня ведаў, што такое Беларусь. Цяпер я зразумеў, што гэта цікава. І цяпер гэта ўпрыгожвае маё жыцьцё. Беларусь вучыць нас цаніць сваю свабоду. У Фінляндыі забываешся, што гэта такое, бо ў нас няма грозных тыранаў. Ваша краіна вучыць нас шанаваць сваю мову, сваю адметнасьць.

— Быкаў распавядаў Вам пра Беларусь?

— Многа. Асабліва ў час нашых супольных вандровак да мяне ў вёску, на хутар. Пасьля гэтага Быкаў сказаў, што я нармальны хлопец, бо ведаю вёску. Быкаў прыгадваў свой хутар, гаспадарку, сваё дзяцінства. Калі я ўбачыў Беларусь у рэале — усё так і аказалася. Успамінаў вайну. Але я ні ў якім разе не прэтэндаваў, не набіваўся ў сябры да Быкава. Бо разумею, што такое Васіль Быкаў, якога маштабу гэты чалавек. Я маладзейшы за яго на 30 гадоў, і не такі літаратар. Таму, калі ў нас здараліся адкрытыя размовы, ініцыятыва заўсёды йшла ад Васіля.

— Чаго не хапала Быкаву ў Фінляндыі?

— Эміграцкая дарога — самотны лёс. Васілю не хапала элемэнтарных чалавечых дачыненьняў зь людзьмі блізкімі, знаёмымі. Расейскамоўная публіка Фінляндыі досыць саўковая, сярод іх няма быкаўскіх людзей. У Быкава адмыслова не было тэлевізара. Ён казаў, што гэта галоўны тэрмінатар часу. У Васіля быў кампутар — для пісаньня. Ён многа працаваў у Хельсынкі.

— Вы, пэўна, знаёмы з сытуацыяй вакол сьмерці і пахаваньня Быкава?..

— Гэта для мяне горка і незразумела. Калі ўжо ўлады вымушаны былі замоўчваць такую справу, гэта прымета таго, што нейкі культурны, інтэлектуальны, маральны рэсурс вычарпаны дарэшты. Застаецца тупое «Не». І страх. Страх перад тым, што такое ёсьць Быкаў.

Гутарыў Сьцяпан Луцкі



Помнік Быкаву на Ўсходніх могілках.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Дзесяць гадоў тэатру

Дэкада ППРБ — драма аб праблемах улады ў мэнтальнай прасторы пераходнага часу, якая не саступае найлепшым трагедыям Шэксьпіра.

Як вядома, байкі Шэксьпіра каціруюцца ня толькі як літаратурныя, але і як гістарычныя. Час, калі Ўільяма грызьлі мукі творчасьці, быў пераломны і супярэчлівы, паколькі якраз тады адбываўся працэс пераходу ад традыцыйнага сярэднявечнага маралітэ да раньнегуманістычных прыколаў. Рычард III, Кароль Лір, Гамлет, Макбэт — ксэракопіі палітыкаў той эпохі (дарэчы, за 200 гадоў да прыходу Лізаветы ў Англіі зьмянілася 14 манархаў, так што рэзюмэ можна было зрабіць добрае). Мараль літаратурных прыгод згаданых пэрсанажаў — цяжкі пераход ад разуменьня ўлады як «родавай», «дадзенай Богам» да канцэпцыі ўлады маральнай. Пакуль венцаносцы дапетрылі гэты банальны пастулят, яны замачылі безьліч чувакоў (Рычард III), або — гл. мэдыцынскую картку Гамлета — сталі шызікамі. Ці не адбываецца нешта падобнае ў адной усходнеэўрапейскай краіне, якая знаходзіцца на паўдарозе ад аўтарытарнай канцэпцыі ўлады, з усімі яе этычнымі атрыбутамі, да новай канцэпцыі — улады маральнай і дэмакратычнай?

У такім кантэксьце асоба яе лідэра набывае абрысы шэксьпіраўскіх пэрсанажаў — экзыстэнцыяльных адзіночак на троне, якім цяжка ўпісацца ў новыя топасы. Выхад — арыгінальна рэфлексаваць. Дацкі кронпрынц прымушаў Гільдэнстэрна лабаць на флейце, а наш лідэр аддае загад усім чыноўнікам чысьціць дахі ад снегу. Шэксьпіраўскі Макбэт верыў прагнозам ведзьмакоў аб тым, што яму абломіцца карона Каўдора, а адзін сучасны палітык — палітаналітыкам, якія прымяраюць яму «шапку Манамаха». «Мой трон на крохкім крышталі», — убіў сабе ў башку Рычард III і мачыў усіх палітычных канкурэнтаў. Мяркую, намёк тут зразумелы. Канфлікт з часам заўсёды мае ў Шэксьпіра трагічны фінал, якому папярэднічае абсалютная маральная псута манархаў — наступства завышаных палітычных амбіцый або крызысу асабістых адносінаў.

Такім чынам, як у кнігах, так і ў жыцьці, усё скончыцца добра. Адно правакацыйные пытаньне: «Калі і што рабіць нам, нявольным удзельнікам пастановы?» Не хацелася б, каб па ходзе п'есы галоўны герой, наткнуўшыся на чарапушку, прачытаў маналёг: «Бедны (Ваша імя і прозьвішча). Я ведаў цябе. Ты быў добры апазыцыйны палітык». Аднак лёс ляяльных Разэнкранца і Гільдэнстэрна, якіх усё адно забілі, нічым ня лепшы. Вось вам і to be or not to be. Вырашайце, хутка трэцяе дзеяньне.

Лёлік Ушкін

КАІСА

Любіў шахматы больш, чым «Капітал»

Гаўрыла Верасаў (1912—1979), шматразовы чэмпіён краіны, міжнародны майстар — адна з сапраўдных зорак беларускага шахматнага небасхілу. Яго дэбют (1. d4 d5 2. Kc3) удзельнікі матчаў за сусьветную карону зазвычай пакідаюць «у рэзэрве», але, пры ўсёй вонкавай прастаце, пабудова белых тоіць для суперніка нямала атруты. Мабыць, таму тэхаскі шахматны майстар Джон Джэйкабс калісьці назваў сваю кніжку «Асьцярожна, дэбют Верасава!» — назва, якую дужа ўпадабаў вынаходнік дэбюту, былы вайсковы карэспандэнт. «Гучыць амаль як «Увага, танкі Гудэрыяна!» — паўтараў ён. Радаваўся, калі гэную кніжку, дасланую чыноўнікамі з ААН (Верасаў быў камуністам і займаў дыпляматычную пасаду), зладзеі, што залезьлі ў ягоную хату, пакінулі на месцы, — нават не пайшоў у міліцыю заяўляць пра крадзеж з узломам.

Як бадай што кожны буйны шахматыст, Гаўрыла Верасаў быў супярэчлівай асобай. Да сёньня ў асяродзьдзі тых, хто ведаў майстра, ходзяць показкі пра яго максымалізм ды звышімкненьне да «справядлівасьці». Зь беларускім грасмайстрам Аляксеем Суэціным яны ледзь ня біліся, аналізуючы свае паядынкі. Пасьля скандальнай партыі з гомельскім майстрам Крупскім у 1966 г. розгалас дайшоў аж да Рыгі… Верасаў лічыў сябе вучнем Міхаіла Бацьвіньніка, які таксама праславіўся неардынарнымі паводзінамі ў жыцьці і за шахматнай дошкай. Карыстаўся ягонай пэдагагічнай сыстэмай, што й дазволіла Верасаву падрыхтаваць колькі выдатных гульцоў — хай сабе і не такіх знакамітых, як вучні Бацьвіньніка Карпаў з Каспаравым. Сутнасьць сыстэмы амаль сакратаўская — пошук разам з вучнямі адказу на іхнія шахматныя пытаньні, у прыватнасьці на пытаньне «Чаму?».

Калегі па фэдэрацыі Верасава помняць, называюць «клясыкам беларускіх шахматаў», «рыцарам ісьціны», захапляюцца яго «блізкасьцю да народу». У памяць Верасава ладзяцца турніры, выходзяць кніжкі, зьняты фільм. У 11-й школе алімпійскага рэзэрву Царанкоў з Купрэйчыкам спрабуюць працягнуць традыцыі свайго настаўніка. Аднак ці дасягне калі-небудзь шахматнае жыцьцё ў Беларусі напалу, уласьцівага верасаўскім часам, — у гэтым варта сумняваецца. Сёньняшнія людзі пры ўладзе шахматы ня песьцяць.

ВР

Як бы вы згулялі?



Г.Верасаў — А.Суэцін, 1953. Пазыцыя з кніжкі В.Купрэйчыка і М.Царанкова "120 найлепшых камбінацый Г.М.Верасава" (Магілёў, 2004). Ход белых.

Адказы на пазыцыю з №25.

1. Te5+! Kpe5 (на 1...Kpd7 2. Te7X, а калі 1...Kpf6, то 2. Ce7+) 2. Cc3+ Kpd6 3. Tb1 Kc3 4. Fd3+ Kpc7 5. Fg3+ і чорныя здаліся.

Адказ на шахматнае заданьне ў "НН" №24: 1. e4! і чорныя губляюць слана з прычыны пагрозы 2. Cb5. У №25 адказ на гэтае заданьне быў пададзены памылкова. Перапрашаем.

● ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ ●

ВІТАНЬНІ

Віншуем Ілону Ўрбановіч-Саўку і Зьмітра Саўку з нараджэньнем сына. Няхай гадуецца на радасьць бацькам!

Дзякую ўсім, хто падтрымліваў мяне ў часе вайсковай службы, — бацькам, братам, родным і блізкім, сябрам і сяброўкам. Сямён

Ксеня! Ня ведаю, што б я рабіў безь цябе ў войску, каму б пісаў доўгія лісты начамі ў нарадах. Дзякуй! Сямён

КВАТЭРА

Сям'я (сумленныя людзі, бяз шк/зв, з в/а) здыме 1-пакаёвую кватэру ў Лошыцы. Паблізу чыгункі. Т.: 8-029-650-46-84, Янак

КАНТАКТЫ

З 16 па 24 жніўня ў г.Паставы Сёстры Служанкі Найсьвяцейшай Панны Марыі ладзяць рэкалекцыі для дзяўчат. Зацікаўленыя, зьвяртайцеся на электронны адрас: terenia@tut.by

Шукаю беларускамоўную дзяўчыну ў Магілёве для знаёмства, паляпшэньня мовы і зьнішчэньня піва. Ліставуйце на Spadar_s@tut.by. Сяржук

КНІГІ, МУЗЫКА

Кнігу спадара Толкіена «Хобіт» у беларускамоўным варыянце набуду. Электронны адрас: a_volskaya@list.ru Т.: 229-58-19

Беларуская музыка ў Магілёве — карычневы шапік ля чыгуначнага вакзалу

Новыя майкі з нацыянальнай сымболікай, шаўроны, значкі, відэа, аўдыё, CD, кнігі, часопісы, падручнікі, слоўнікі, календары на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) з панядзелка па пятніцу з 13.30 да 19.30. Т.: 707-40-01

Кніжка «Залатыя дыскі беларускага рок-ролу». Аўтары: Сяргей Будкін, Павал Сьвярдлоў, Алекс Стрэл. Гісторыі запісаў самых пасьпяховых альбомаў і пакручастых лёсаў айчынных рок-зорак. Пытайцеся на кніжнай выставе БНФ

Куплю кнігу «Геаграфія Беларусі» А. Смоліча 1994 г. выданьня. Т.: 214-4-214

Шырокі выбар CD у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13-й

Прадам «Беларускую энцыкляпэдыю» ў 18 тамах (тамы 1—16) па сабекошце. Т.: 8-029-704-88-50

Прадам этналінгвістычны слоўнік «Славянские древности» (т.1, 2) за 110000 рублёў. Т.: 8-029-400-45-91

Прадам ці абмяняю «Расейска-крыўскі слоўнік» В.Ластоўскага. Т.: 230-91-53

Набуду: Я.Купала, 1 том; «Меншчына» з сэрыі «Мой родны кут». Т.: 259-55-40

Куплю касэты «Ulis» («Люстэрка» і іншыя альбомы), WZ-orkiestra («Паравіны году»), Pomidoroff («Сьвята Пакрадзенае»), «Гарацкія». Т.: 295-67-46

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

Дзякуй моладзевай ініцыятыве «Краявід» зь Берасьця, што падпісала на «НН» 32 падпісчыкі ў Берасьці й вобласьці, якія мелі ў тым патрэбу. Дзякуй тым, хто дапамог «Краявіду» ў гэтай справе.

30 ліпеня—2 жніўня
запрашаем у вандроўку
«Золота Підкова» Львоўшчыны

Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск

Кошт вандроўкі: для дарослых — 45 у.а. + 15000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. +1500 руб.

Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі 0,1—0,5 у.а.).

Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.

Т.: 8-029-551-30-75, 222-88-76
http://altusplus.narod.ru

Людка Сільнова

Мілаград

I

Неадступна, наўздагад —
Выплывае Мілаград
З мора васільковых хваляў,
Запаветны горад-сад.

Пасярод яго — палац,
Там дзяды ня моцна сьпяць.
Малаком бялеюць сьцены,
Макам макаўкі гараць...

II

Як вужака, у траве
Рэчка бліскае — заве
У таемную прастору,
Што па два бакі яе!

Выпарэньні, галасы?
Нетутэйшае красы
Шэпчуць скрыўленыя словы
Залатыя каласы...

III

І зь якой такой імглы
Точыцца да нас стары,
Быццам гук вандроўнай ліры,
Лёгкі, як уздых зямлі,

Ўвесь у зелені прысад,
Чарадзейны, як смарагд,
Крышталёвага аблічча
Горад-казка — Мілаград?..

24 ліпеня
запрашаем у вандроўку
Каралеўская Горадня

Мураванка: Маламажэйкаўская царква.
Горадня: Каложа, Фарны касьцёл Сьв.Францішка Ксавэр'я, Верхняя царква, Гарадніца Тызенгаўза, Драмтэатар, Заапарк, Касьцёл Адшуканьня Сьвятога Крыжа і манастыр бэрнардынцаў, Лямус пры Брыгіцкім манастыры, Ніжняя царква, Новы замак, Стары замак.

Летні распродаж кніг:

Ян Станкевіч. Збор твораў у двух тамох. Том 1—552 с. Том 2—588 с. Цана 8 тыс. рублёў.
Ян Станкевіч. Гістарычная творы. 776 с., цьвёрдая вокладка. Цана 7 тыс. рублёў.
Андрэй Катлярчук. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў. 274 с., цьвёрдая вокладка. Цана 2 тыс. рублёў.
Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне. 472 с. Цана 1 тыс. рублёў.
Беларуска-расейская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы. 424 с. Цана 2 тыс. рублёў.
Паліталёгія. Асноўны курс. Пер. зь ням. 680 с. Цана 3 тыс. рублёў.
Пры замове больш як 2 кніжак — трэцяя ў падарунак («Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі»).
Увага: прапанова дзейнічае да 30 жніўня!
Замаўляйце праз тэлефон (029) 643-57-33, e-mail exlibris@tut.by або напісаўшы на адрас 220050, п/с 333, Менск.

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
фота-рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3368. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 14.07.2004.
Замова № 4303.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а